Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Масленіца ў Нарве ☞ 5-11

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 12 (28611) Год LVI | Беласток, 20 сакавіка 2011 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 5%)

XVII БЕЛАРУСКАЯ АЛІМПІЯДА

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Вядучай тэмай XVII Алімпіяды беларускай мовы была беларуская гісторыя ў творчасці Уладзіміра Караткевіча. 80-я гадавіна з дня нараджэння гэтага пісьменніка адзначалася ў 2010 годзе, калі адбываліся школьныя элімінацыі і вучні рыхтаваліся да далейшых этапаў спаборніцтваў. У час пазаўрочных заняткаў ліцэісты аналізавалі прозу і паэзію пісьменніка. Старэйшыя вучні займаліся творчасцю Уладзіміра Караткевіча таксама на занятках беларускай мовы. Беларуская алімпіяда з-за сваіх прывілеяў настолькі прывабная, што ліцэісты пачынаюць рыхтавацца да яе ўжо з першага класа звышгімназічнай школы.

Тады папаўняюць яны свае веды і ўмеласці ў час пазаўрочных заняткаў і дома. На цэнтральных элімінацыях алімпіяды, якія праходзілі 10 сакавіка ў Бельскім белліцэі, ліцэісты пісалі працы па творчасці Уладзіміра Караткевіча не толькі таму, што былі да гэтай тэмы добра падрыхтаванымі, але і таму, што ім спадабалася проза і паэзія Караткевіча, а асабліва зацікавіў іх гістарычны кантэкст у яго творчасці. Аналізуючы выбраныя творы, вучні маглі спасылацца на славутыя моманты ў гісторыі беларускіх зямель. Усе бельскія белліцэісты і частка гайнаўскіх пісалі творчыя працы аб гісторыі ў жыцці і творчасці Уладзіміра Караткевіча. Вучні Гайнаўскага белліцэя пісалі таксама сачыненні пра каханне ў паэзіі Уладзіміра Караткевіча і работу па творчасці членаў Літаратурнага аб'яднання „Белавежа".

— У Беларусі, Польшчы і на эміграцыі Уладзімір Караткевіч успрымаецца як выдатны пісьменнік і публіцыст. Пры нагодзе юбілею мы вырашылі зрабіць яго творчасць вядучай тэмай сёлетняй алімпіяды. У прозе яго мова простая і зразумелая ліцэістам. Моладзь можа ўспрымаць яго як беларускага Генрыка Сянкевіча, які ідэалізуе гісторыю, — сказаў старшыня арганізацыйнага камітэта Алімпіяды беларускай мовы, прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

Да цэнтральных элімінацый алімпіяды прыступілі 7 вучняў Гайнаўскага белліцэя (да раённых — 22), 7 бельскіх белліцэістаў (да раённых — 12) і адзін ліцэіст з Беластока (да раённых — 1). Вучні, якія пісалі працы з ухілам на гісторыю Беларусі ў творчасці Караткевіча, хвалілі творы выдатнага беларускага пісьменніка.

— Творчасць Караткевіча цікавая і падобная да гістарычных твораў Генрыка Сянкевіча. Я таксама люблю прозу польскага пісьменніка, — заявіла Магда Куптэль з Бельскага белліцэя.

— Цікавыя проза і паэзія Караткевіча, але многія яго творы доўгія і таму мы рыхтаваліся да алімпіяды таксама на падставе апрацаванняў яго твораў. Аднак у асноўным прозу і паэзію мы аналізавалі на пазаўрочных занятках, — гаварылі ўдзельнікі алімпіяды.

— Мы ў Гайнаўскім белліцэі пачынаем рыхтаваць вучняў да алімпіяды ўжо з верасня і спатыкаемся на пазаўрочных занятках ажно да самых цэнтральных элімінацый. Найбольш увагі я адводжу аналізе літаратурных твораў, а перад цэнтральнымі элімінацыямі я звяртаў асаблівую ўвагу на гістарычны фактар у творчасці Караткевіча. Аналізавалі мы таксама паэзію Караткевіча, менш увагі адвялі яго драмам, бо ўсяго ж не паспееш дэталёва прааналізаваць, а і не ўсе вучні хочуць чытаць таўсцейшыя творы, — расказваў настаўнік беларускай мовы Ян Карчэўскі. — Трэба было таксама звяртаць увагу на граматыку і пераклады, але вядома, што галоўны націск ставім на літаратуру, бо і творчыя работы найбольш бяруцца пад увагу пры ацэнцы пісьмовых прац удзельнікаў алімпіяды.

Вучням трэба было таксама выконваць заданні па граматыцы і зрабіць пераклад тэксту з польскай мовы на беларускую.

— Заданні па граматыцы ў асноўным былі простымі, але можна было зрабіць памылкі ў практыкаванні па лічэбніках. Затое вельмі цяжкім быў пераклад з польскай мовы на беларускую. Трэба было ў ім называць па-беларуску пароды птушак, звяроў, раслін, а нават ведаць некаторыя беларускія геаграфічныя назвы, — гаварылі ліцэісткі.

У час цэнтральных элімінацый, так як і на мінулагодніх цэнтральных спаборніцтвах беларускай алімпіяды, вусныя іспыты адбываліся інакш, чым гэта было раней, калі вучні рыхтаваліся па ўсёй беларускай літаратуры і адказвалі толькі на адно пытанне ў білеце. Перад цэнтральнымі элімінацыямі алімпіяды ў ліцэі былі дасланы тэмы да вусных адказаў. Тычыліся яны розных перыядаў гісторыі беларускай літаратуры. Вучні выбіралі з іх па дзве або тры тэмы і на іх падставе рыхтаваліся да вусных адказаў (маглі таксама рыхтавацца па адной сваёй прапанове), а тэмы ў ліцэістаў, нават з той самай школы, маглі паўтарацца. Камісія паказвала па якой тэме, з трох прапанаваных, вучні мелі расказваць, а па двух апошніх тэмах камісія магла ставіць ліцэістам пытанні. Удзельнікі алімпіяды гаварылі, што разам з новай прапановай знікла выпадковасць, калі адны вучні маглі выцягнуць білет з простай да расказу тэмай, а іншыя, на іх погляд, з вельмі складанай. Аднак пастарому адбываецца вусная частка алімпіяды ў час раённых элімінацый і асобы, што дайшлі да цэнтральнага этапу, раней і так мусілі рыхтавацца па ўсёй беларускай літаратуры.

— Цяпер мы можам лепш падрыхтавацца да вусных выступленняў, а ў час раённых элімінацый было больш выпадковасці, — заявілі гайнаўскія ліцэісткі Анна Раманюк, Юстына Аварчук і Віялета Башун.

— Я б не сказала, што мы цяпер менш працавалі, рыхтуючыся да вусных іспытаў, чым перад раённымі элімінацыямі, але маглі працаваць па тых тэмах і аналізаваць творчасць тых пісьменнікаў, якія нам падабаюцца, а пры гэтым пазбеглі білетаў з тэмай пра творчасць, якая нам увогуле не падыходзіць, — сказала Марта Бяляўская з Бельскага белліцэя.

Падобны падыход да змены спосабу вусных расказаў мелі таксама іншыя белліцэісты.

— Да вусных расказаў вучні выбралі разнародныя тэмы па айчыннай і эміграцыйнай беларускай літаратуры, а таксама па гісторыі ў беларускай літаратуры. У агульным узровень вусных выказванняў быў высокі, відаць было, што вучні з дапамогай настаўнікаў добра да іх падрыхтаваліся. Мова ў ходзе расказаў была на добрым узроўні, а пры гэтым ліцэісты часта выбіралі тэмы больш складаныя, з нейкімі праблемамі, — заявіла пасля вусных іспытаў настаўніца Валянціна Бабулевіч. — Рыхтуючыся да выступленняў з формулай трох тэм, вучні карысталіся таксама пазапраграмнай беларускай літаратурай, чыталі дадатковыя творы або іх фрагменты.

— У агульным узровень падрыхтоўкі вучняў да нашай алімпіяды не найвышэйшы, але заўважаецца яго рост. Асобы, якія даходзяць да цэнтральных элімінацый, прэзентуюць ужо прыстойную падрыхтоўку, — сказаў старшыня алімпіяды прафесар Аляксандр Баршчэўскі.

— Прывілеі Алімпіяды беларускай мовы надалей значныя і яе лаўрэаты па-за конкурсам будуць прымацца не толькі на шматлікія гуманітарныя спецыяльнасці Варшаўскага ўніверсітэта, але таксама на фізічны, матэматычны ці інфарматычны факультэты гэтага ж універсітэта. Многа падобных прапаноў чакае нашых лаўрэатаў у Каталіцкім люблінскім універсітэце. Ёсць таксама спецыяльнасці, на якія будуць прымаць без дадатковай кваліфікацыі лаўрэатаў алімпіяды па беларускай мове ў Вармінска-Мазурскім універсітэце і ў шматлікіх іншых вышэйшых навучальных установах. Напрыклад, у Політэхнічны інстытут у Жэшаве лаўрэаты нашай алімпіяды могуць паступаць без конкурсу на прэстыжную спецыяльнасць маркетынг і кіраванне і выбіраць там адну з трох спецыялізацый. Аднак, на жаль, я не знайшоў ніякіх прапаноў для нашых лаўрэатаў у беластоцкіх навучальных установах, па-за беларускай філалогіяй, — сказаў настаўнік Гайнаўскага белліцэя Ян Карчэўскі. — Нашы вучні карыстаюцца гэтымі прывілеямі, хаця зараз цяжка акрэсліць, на якія спецыяльнасці хочуць паступаць нашы выпускнікі.

9 770546 196000

Электрычнае крэсла

Японія — не Савецкі Саюз, у якім атамная станцыя абавязкова мусіла некалі ўзарвацца з-за недасканалых тэхналогій і сацыялістычнай нядбайнасці. І не Расійская Федэрацыя, дзе перыядычна і пастаянна здараюцца аварыі на электрастанцыях усіх відаў і выглядаў, паступова падбіраючыся і да ядзерных. І ўсе гэтыя трагедыі ў Расіі здараюцца па ўсё тых жа запазычаных з СССР прычынах, якія Расія атрымала ў спадчыну разам з імперскім мышленнем і татальным кантролем КГБ за ўсімі працэсамі ў грамадстве і эканоміцы. Ну і, канешне, Японія не сённяшняя Беларусь, дзе небяспечны аб'ект можа выбухнуць яшчэ да пачатку сваёй працы, бо яго абавязкова хтосьці хоча паставіць акурат на адзіным вялікім сейсмічным разломе, які знаходзіцца на яе тэрыторыі.

Тыя, хто настойвае на пабудове атамнай станцыі менавіта на Астравеччыне, у сваёй прапагандзе якраз і спасылаюцца на вопыт Японіі. Кажуць, што там уся тэрыторыя сейсмічна актыўная. І што з таго? Атамныя электрастанцыі, маўляў, там паставілі, і нічога з імі не робіцца.

Але зрабілася. Трагедыя навалілася па даўно заўважаным назіральнымі людзьмі законе тэатра — калі ў першым акце на сцяне вісіць стрэльба, то як мінімум у трэцім яна павінна пальнуць. Электрастанцыя, пастаўленая на сейсмічна небяспечнай тэрыторыі, не вытрымала землятрусу. Дысцыплінаваныя японцы, узброіўшыся сваім багатым вопытам змагання з радыяцыяй, навейшымі здабыткамі японскай і сусветнай медыцыны, найноўшымі і надзвычай дасканалымі тэхнічнымі вынаходніцтвамі змагаюцца за мінімалізацыю наступстваў трагедыі. Але, хоць японскія праектанты атамных электрастанцый зрабілі ўсё магчымае на выпадак аварыі, ахвяр ад праблем непасрэдна на электрастанцыі пазбегнуць не ўдалося. Тым, хто загінуў, ужо не патрэбны ні танная электрычнасць, ні перспектывы развіцця мірнага атама.

Атамная электрастанцыя „Фукусіма-1" не змагла вытрымаць вялікага прыроднага катаклізму. А ў Беларусі, менавіта на Астравеччыне, зафіксаваны прэцэдэнт самага моцнага беларускага землятрусу.

У 1909 годзе, у выніку падземных штуршкоў, там з'явіўся глыбокі роў з вярсту. Пазней беларускія навукоўцы ацанілі той землятрус у сем балаў паводле шкалы Рыхтара. Гэтага дастаткова, каб знішчыць нават надзвычай моцны аб'ект. А каб разбурыць расійскую пабудову (фінансаваць Астравецкую АЭС будзе Расія), сямі балаў непатрэбна. Небяспеку для аб'екта, які зробіць краіна са спадчынай Савецкага Саюза, з састарэлымі тэхналогіямі, з няякаснымі матэрыяламі, можа стварыць нават калгасны трактарыст, які, кульнуўшы адзіна якаснага мясцовага прадукту, урэжацца на вырабе хвалёнага МТЗ у слуп недалёка ад АЭС.

Справа нават не ў тым, што ад планаванай Астравецкай АЭС усяго шэсцьдзесят кіламетраў да Вільні. А да Астраўца, Смаргоні, Ашмян — рукой падаць. І не ў тым, што ў нашых пацярпелых не будзе японскіх тэхналогій ліквідацыі наступстваў. Не будзе і адпаведных сучасных медыкаментаў. Трагедыя ўжо існуе ў тым, што ў нацыянальных навуковых свяцілаў, што настойваюць на астравецкай пляцоўцы, няма мінімальнай павагі да ідывідуальнага чалавечага жыцця і здароўя, якое можа быць падвергнутае небяспецы. Адсутнічае ў іх душах не толькі боль, але нават дробнае перажыванне за здароўе і будучыню нацыі, якая і так узяла на свой генафонд надта вялікі ўдар пасля чарнобыльскай трагедыі. Пра ўладу тут няма і гаворкі. Ва ўмовах унутранай духоўнай і ідэалагічнай акупацыі спадзявацца на яе — справа марная.

Беларуская народная мудрасць кажа, што раз на год нават палка страляе. А хто ведае, колькі ён цягнецца той атамны год? І калі тая палка стрэльне? Свет ужо пабачыў малыя і вялікія трагедыі, звязаныя з мірным атамам. А беларусы пазналі на сабе самую вялікую ядзерную катастрофу. Можа больш разумным было б планаваныя на пабудову Астравецкай АЭС сродкі выкарыстаць нам на пошук новых, бяспечных крыніц энергіі, а не пераўтвараць нашу краіну ў суцэльнае электрычнае крэсла, на якое прымусова пасаджаны ўвесь народ, і якое невядома калі можа ўключыцца.

Віктар САЗОНАЎ

Высокі стыль

Пляваць я хацеў на ўсе іх каментары, — Аляксандр Лукашэнка адразу пасля вяртання з Сочы ў такі вытанчаны спосаб адрэагаваў на хвалю крытыкі, якая абрынулася на яго з Захаду пасля апошніх выбараў. Гэтым самым абверг чуткі пра траўму, якую быццам бы атрымаў на лыжах у алімпійскім курорце. Нічога такога не здарылася, кіраўнік дзяржавы ў добрым фізічным здароўі. Галава таксама варыць па-ранейшаму, язык перамолвае адвечную песню на стары лад: пра нядобрых і непарадачных людзей вакол Беларусі ды ворагаў і адмарозкаў унутры краіны. Нягледзячы на ўсе інтрыгі, нікому не ўдасца паставіць Лукашэнку на калені, а той-сёй і па галаве атрымае „на всю катушку".

Расправа з ворагамі, як звычайна, акрашаная саліднай порцыяй хамства. На гэты раз Лукашэнка праехаўся па гомасексуалістах. Такім чынам адпомсціў міністру замежных спраў Германіі Гіда Вестэрвеле, які не скрывае сваёй полавай арыентацыі: „В Германии это возможно, и в Польше, тогда пусть этим и занимаются там. А нам сюда это не надо. Хотя этого добра и у нас, к сожалению, хватает».

Падчас перадвыбарчай сустрэчы з кіраўнікамі дыпламатычных ведамстваў Германіі і Польшчы, як расказваў Радаслаў Сікорскі, Рыгоравіча панясло яшчэ далей. Ён голасна абураўся тым, што могуць разам жыць два мужчыны, хаця дабаўляў, што дзве жанчыны ў пасцелі, гэта апетычная карціна. Напомню, што пасля нядаўняй падобнай заявы аднаго дэпутата польскага Сейма, некалькі дзён шумела ўся краіна. Кожнае глупства Аляксандра Лукашэнкі таксама не праходзіць бясследна. Але дае адваротны эфект. Народ бярэ прыклад ад свайго правадыра.

Памятаеце слаўныя словы Лідзіі Ярмошынай з паслявыбарчай гарачай ночы: „Гэтым жанчынам няма чаго рабіць, толькі па плошчах швэндацца. Лепш сядзелі б дома і боршч варылі"? Так яна пракаментавала ўдзел вялікай колькасці жанчын у дэманстрацыі супраць фальсіфікацыі выбараў. Пры чым, слова „жанчыны" было сказана па-беларуску (уся заява — па-расейску) з асаблівым скрыгатам зубоў і насмешлівым націскам. Так сама, як часам у сваіх прамовах свядома ўжывае беларускія словы Лукашэнка з мэтай асмяяць, дыскрэдытаваць апазіцыю. За гэтую вобразную параду Лідзія Ярмошына заслужана атрымала ад беларускіх інтэрнаўтаў прыз „Сексіст 2010 года", апярэдзіўшы нават самога кіраўніка дзяржавы, якому за словам у кішэнь не лезці. Але, з другога боку, можа гэта і не дзіўна, бо ж Аляксандр Рыгоравіч усюды, як умее, славіць „жэншчын".

Могуць дазволіць сабе моцнае слоўца менскія тузы? Могуць і правінцыйныя валеты. Станіслаў Сямашка — старшыня афіцыйнага Саюза палякаў у Беларусі — пра Польшчу і польскіх палітыкаў сказаў: „Да хрен с ней, с их страной! Но какое они имеют право делать так, что я в Литву не имею право ехать?! Или в Германию, или Францию? Это унижение!" Гэта была рэакцыя на забарону Сямашку ўезду ў краіны Еўрасаюза. Вострая, але шчырая, як сам прызнаўся журналістам пару дзён пазней. Ён не саромеецца за свае словы і нават на адкрыцці музея Чэслава Немэна ў Старых Васілішках усур'ёз аб'яцаў запрасіць туды прэзідэнта Браніслава Камароўскага. Цікава, якімі словамі ён яго там прывітаў бы?

Вярнуся яшчэ да Лідзіі Ярмошынай. Аказваецца, яна здольная не толькі на кулінарна-бытавыя парады, але і ўмее бліснуць гістарычнымі ведамі. Спіс беларускіх палітыкаў, чыноўнікаў і журналістаў, якім забаронены ўезд у Еўрасаюз, параўнала да спісаў ваеннага часу, у якіх гітлераўцы паведамлялі прозвішчы расстраляных. Як ні глядзі, моцнае параўнанне! Відаць былым партызанам ад яго аж дух заняло. Заўсёды скорыя да пратэстаў, калі што пра вайну нязгодна з лініяй Саўінформбюро, тут як вады ў рот набралі. Сапраўды, тое, што Лідзія Міхайлаўна не пагуляе па парыжскіх бульварах — кара, якую можна параўнаць адно з расстрэлам.

Мо замест у Цэнтральную выбарчую камісію пхацца, упрыгожваць сваёй асобай дзяржаўныя тэлестудыі, даваць публічна добрыя парады, трэба было боршч варыць...

Мікола ВАЎРАНЮК

Вачыма еўрапейца

Інтэрнэтнае інтэрв'ю

Ад таго часу, калі я займаюся журналісцкім рамяством, з вялікім недаверам падыходжу да інтэрв'ю з вядомымі асобамі, асабліва з палітыкамі, якія мае калегі праводзяць па інтэрнэце. Сам я як агню асцерагаюся такой формы прэсавай размовы. Перш за ўсё таму, што асабліва палітыкі такім шляхам не даюць мне шанцаў на дакладнае распытанне, з лёгкасцю ўцякаюць ад цяжкіх пытанняў — ад канкрэтнага ў збітыя фразы. Мабыць, таму вельмі часта чуецца ад шмат каго з палітыкаў: „Калі ласка, перадайце мне вашы пытанні пісьмова".

Вельмі часта тады няма гарантыі ці адказвае сама распытваная асоба, ці хтосьці, скажам, з яе асістэнтаў, дарадчыкаў, піяраўцаў і гэтак далей.

Тыповая інтэрнэтная размова паявілася ў апошні час у беластоцкім дадатку да „Выбарчай газеты". Журналістка паставіла некалькі пытанняў (дарэчы, важных) прэзідэнту Браніславу Камароўскаму. Прабавала разведаць яго думку аб справах м.інш. нацыянальных меншасцей у Польшчы, у тым ліку беларускай, і Беларусі. Тыповым ухіленнем прэзідэнта быў адказ на пытанне: „Ад некалькіх гадоў дзяржаўныя датацыі для арганізацый нацыянальных меншасцей у Польшчы пастаянна малеюць — ці гэта адпаведная палітыка?". Прэзідэнт на пачатку кінуў труізмам, што нацыянальныя і этнічныя меншасці мусяць быць падтрымліваныя дзяржавай, што Польшча выконвае гэтае заданне з 1989 г., і што сітуацыя нацыянальных меншасцей у Польшчы папраўляецца, каб на канец заявіць:

— Несумненна, аб узроўні фінансавай падтрымкі меншасцей трэба размаўляць, прымаючы пад увагу так і бягучыя патрэбы ды перспектывы развіцця дадзенай меншасці, як і становішча дзяржаўных фінансаў.

Якія гэта патрэбы і якія перспектывы меў на думцы прэзідэнт, таго ўжо немагчыма з размовы даведацца. Таму што інтэрв'ю павярнулася ў пытанні наконт выкарыстання шматкультурнага і шматканфесійнага патэнцыялу Падляшша пры будучым прэзідэнцтве Польшчы ў ЕС.

— Невыпадкова адным з прыярытэтаў нашага прэзідэнцтва будзе ўсходняя палітыка і наш еўрасаюзны праект Усходняга партнёрства. Таксама ў гэтым кантэксце патэнцыял усходняй Польшчы, між іншым і Падляшша, можа будзе лепш бачыцца, таксама ў Бруселі.

Журналістка кранула таксама пытанні малога памежнага руху (МПР). Толькі што засяродзілася на планах датычных падпісання адпаведнай дамовы з Расіяй, а пан прэзідэнт ні адным словам не ўспомніў пра тое, што далей з непадпісанай прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам такой жа дамовай паміж Польшчай і Беларуссю. Затое вее ад іх надзеяй:

— У сакавіку 2011 г. Польшча будзе старацца ў Бруселі за пашырэнне абавязваючай зоны пры нагодзе перагляду актуальна абавязваючых паразуменняў аб МПР ды еўрасаюзнага распараджэння ў гэтай справе ад 2006 г.

На канец, здалося мне, калі я чытаў гэтае інтэрв'ю, што беластоцкі віцэ-прэзідэнт Аляксандр Сасна не з'яўляецца дарадчыкам прэзідэнта па справах нацыянальных, этнічных і канфесійных меншасцей у Польшчы ўвогуле, а толькі „дарадчыкам па справах вернікаў праваслаўя". Браніслаў Камароўскі нават заявіў:

— Назначэнне пана Аляксандра Сасны паказвае вагу, з якою польская дзяржава павінна ставіцца да пытанняў звязаных з функцыянаваннем гэтай канфесійнай групы.

Можа на дэталёвыя адказы прыйдзе час, калі ўрэшце Браніслаў Камароўскі пакарыстаецца запрашэннем падляшскага дэпутата ад Грамадзянскай платформы Роберта Тышкевіча да наведання беларускіх гмін Беласточчыны, жыхары якіх падтрымалі яго рашучай большасцю на апошніх прэзідэнцкіх выбарах. Аб такім запрашэнні дэпутат гаварыў зараз пасля выбараў. Прэзідэнт і яго Канцылярыя пакуль маўчаць на гэты конт.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Тэкст і фота
Аляксандр ВЯРБІЦКАГА

Пазнаць мукавісцыдоз

Кожны па-свойму чакае надыходзячага дня, надыходзячай ночы. З трывогай глядзяць у найбліжэйшую будучыню сямейнікі хворых, асабліва тых хворых, з нямогласцямі якіх не заўсёды можа справіцца сучасная медыцына. Многа такіх трывожных дзён і начэй выпала на долю сям'і настаяцеля прыхода святой Ганны ў Баратынцы-Рускім, што каля Сямятыч, айца Андрэя Апольскага. У чэрвені 2007 года ў ягонай сям'і нарадзілася дачушка Зузя і з першых дзён давялося весці трывожнае змаганне за ейнае маладзенькае жыццё. Выявілася, што дзяўчынка хворая мукавісцыдозам (CF, *cystic fibrosis*), рэдкай хваробай, якая характарызуецца ўзбуйненым выдзяляннем арганічнай слізі, якая — у сваю чаргу — закупорвае органы ўнутранай сакрэцыі, выклікае цяжкія пашкоджанні функцыянавання дыхальных, полавых і стрававальных органаў. У мукавісцыдозу каля 1600 разнавіднасцей і пра самую гэтую хваробу больш падрабязна можна даведацца, напрыклад, у інтэрнэце. З пакутамі Зузі Апольскай і ейных сямейнікаў зацікаўленага чытача адсылаю на сайт www.zuzia.muko.med.pl.

З айцом Андрэем Апольскім сустракаюся напярэдадні ладжаных 5 сакавіка лекцый на тэму мукавісцыдозу, лекцый для сямейнікаў хворых, для медыцынскага персаналу, для зацікаўленых, дзе даклады зачыталі вядучыя беластоцкія спецыялісты; дні 28.02-06.03 аб'яўлены Агульнапольскім тыднем мукавісцыдозу.

— Хвароба прыйшла да нас па волі Божай, бо ў жыцці нічога выпадкова не здараецца, усё адбываецца па Божай волі — усё, што было, ёсць і будзе. Мы самі з'яўляемся прыкладам Божай справядлівасці, бо Гасподзь у Евангеллі ад Іаана гаворыць: „Памятайце, што гэта не вы Мяне выбралі, а Я выбраў вас". Думаю, што і Зузя, і я, і мая матушка, і мае сыны патрэбныя для такой малой царквы, якая называецца мукавісцыдозам. Гасподзь пасярэдзіне зямлі пабудаваў царкву, у ёй крыж, а на крыжы пакуту і гэта з'яўляецца сутнасцю нашага быту. Пасля нараджэння Зузі нам давялося вытрымаць тры аперацыі, яна была два з паловай месяца ў беластоцкім шпіталі, пасля час нейкі была дома. Наша жыццё стала папраўляцца ў розных вымярэннях, калі мы паехалі ў Варшаву ў Цэнтр здароўя дзіцяці, а там лекары, якія ўзяліся за лячэнне, далі нам надзею, што будзе добра, што тут не трэба рыхтаваць труны, не трэба чакаць смерці, што лекары будуць за яе змагацца, што яна будзе акуратнай дзяўчынай, што будзе калісь хадзіць у школу, будзе мець хлопцаў, будзе штудзіраваць. А медыцына ідзе далей, шукае новых развязак, а Гасподзь дазваляе атрымліваць новыя лекі; і што ўсё будзе добра. Гэты першы наш візіт у Цэнтр выпаў у дзень святых Касмы і Дзям'яна. Пазней я паехаў у Беларусь у Хмялева, да бацюшкі Серафіма. Ён перадаў нам ікону святога Іаана Кармянскага, цудатворцы. І спытаў мяне, ці я маю такую ікону. Я шчыра прызнаюся, што нават не ведаў пра такога святога, бо ж усіх святых цяжка пералічыць, нават бацюшку, бо ж іх, як гаворыць Свяшчэннае Пісанне, як пяску марскога. Я адказаў, што ў маёй царкве ёсць многа ікон, што ёсць нават такія, якіх у Польшчы няма, але такой не маю. Ён сказаў мне прыехаць пасля нейкага часу і ён дасць мне мошчы святога Іаана Кармянскага. Тыя мошчы мы атрымалі, унеслі іх урачыста ў нашу царкву, адслужылі літургію, акафіст. На акафістах асвячаем лякарствы хворым, асабістыя рэчы, змазваем алейчыкамі. І ўжо збыліся многія цуды, людзі звоняць да нас, дзякуюць.

Пасля мы сталі дзейнічаць у арганізацыйным напрамку. Ёсць Фундацыя MATIO.

— ***А што гэтая назва абазначае?***

— Заснаваў гэтую арганізацыю адзін з бацькоў, Павал Вайтовіч з Кракава, у якога быў хворы сын. Сын называўся Матэвуш, а яны дома называлі яго Matio, і ад яго ўзялася гэтая назва — гэта не абрэвіятура. Гэта вельмі разумны, спрактыкаваны жыццём чалавек. Мяне тут выбралі дырэктарам Паўночна-ўсходняга аддзялення Фундацыі ў Беластоку, якое ахоплівае Падляшскае і Мазурска-Вармінскае ваяводствы; гэта, вядома, пасада грамадская, бо мы ўсе працуем на грамадскіх прынцыпах. Мы тут ужо шмат чаго зрабілі. Асабліва добра складваецца нам супрацоўніцтва з Нацыянальным фондам здароўя (НФЗ), асабліва яго дырэктарам Яцкам Раледэрам — гэта вельмі добры чалавек у адносінах да нас; мяркую, што і да ўсіх патрабуючых, хаця часта даводзіцца чуць нараканні на гэтую ўстанову. Але нам, што змагаемся з мукавісцыдозам, НФЗ памагае. Ва Універсітэцкім клінічным шпіталі створана мукавісцыдозная кансультацыя. Мы, вось, 5 сакавіка ладзім сустрэчу ў сувязі з X Агульнапольскім тыднем мукавісцыдозу, які сёлета адбываецца пад лозунгам „Rodzina". 28 лютага адзначаўся Сусветны дзень рэдкіх хвароб, які таксама праходзіў пад гэтым лозунгам. У мукавісцыдозе ёсць так, што лячэннем трэба займацца ўсёй сям'і. Часта бывае так, што сем'і нас не разумеюць, адварочваюцца, нават радня. А гэта людзі, якіх трэба адукаваць, трэба пашыраць іхнія гарызонты, трэба каб яны пазнавалі. І таму на гэтую нашу канферэнцыю запрошаны таксама сем'і, лекары першага кантакту, медсёстры, акушэркі, студэнты медыцыны.

Сёння людзі ўжо крыху ведаюць больш. Калі званю да каго і пытаю, ці ведае, што такое мукавісцыдоз, многія гавораць, што чулі, ведаюць нямногія, але многія чулі па радыё ці тэлебачанні, бачылі плакаты. І гэтая апостальскага кшталту місія, за якую дзякую і вашай рэдакцыі, і Радыё Рацыя, і Беластоцкаму тэлецэнтру, беластоцкім парталам bialystokonline.pl і bialystok.pl ды іншым сродкам масавай інфармацыі. Дзякую таксама ўладыку Іаакаву і дырэктар Цэнтра праваслаўнай культуры спадарыні Жданук за прыхільнасць да нашых патрэб. Дзякую бацюшкам Яну Койла з Радыё Orthodoxia і бацюшку Андрэю Місяюку з Беластоцкага тэлецэнтра. Прадстаўленне ў медыях нашых спраў таксама трэба лічыць родам своеасаблівага лячэння. Я асабліва ўдзячны пані доктар Аліне Мінароўскай, якая вельмі рупліва памагае лячыць хворых дзяцей, а яе сын Лукаш займаецца лячэннем дарослых. Гэта людзі, якія ведаюць і чуюць мукавісцыдоз, бо мала ўмець лячыць, трэба хваробу адчуваць, трэба ўвайсці ў яе сутнасць, бо, як гаворыць прыказка — сыты галоднага не зразумее. І нам важна, каб людзі нас пабачылі, каб пра нас даведаліся. Усе беластоцкія фірмы публічнага транспарту падключыліся да акцыі інфармавання пра мукавісцыдоз, у беластоцкіх аўтобусах прадбачаны шыльдачкі пра гэта.

Вельмі важнай для нас справай з'яўляецца здабыванне грошай на лячэнне дзяцей, на аплачванне ім лякарстваў, гэта перадача на наш фонд аднаго працэнта ад падаткаў, упісваючы ў **PIT нумар KRS 0000097900 з абавязковай прыпіскай „Oddział Białystok" (На лячэнне Зузі Апольскай ёсць асобны рахунак KRS 0000064892 з прыпіскай „Dla Zuzi Opolskiej" — А. В.).** Бо лячэнне мукавісцыдозу вельмі дарагое. Ёсць вельмі дарагія лекі, напрыклад, калі Зузю заатакавала адна бактэрыя, то адзін месячны камплект лякарстваў каштаваў восем тысяч злотаў, а Зузя прыняла іх тры. Неабходная рэабілітацыйная камізэлька — 29 тысяч, інгалятары каштуюць ад тысячы да трох. Дзеці прымаюць мноства лякарстваў.

Мукавісцыдоз з'яўляецца генетычнай хваробай, невылечнай, смяротнай. Сярэдняя працягласць жыцця польскіх хворых мукавісцыдозам дзяцей не дасягае дваццаці пяці гадоў. Сёлета ў лютым памерлі ў Польшчы тры асобы ва ўзросце 19, 23 і 25 гадоў. Я сам хаваў 19-гадовую дзяўчыну з Нурца, быў на паховінах 16-, 8- і 12-гадовых дзяцей; памерла дзяўчынка, якая пражыла толькі чатыры гады. Мукавісцыдоз прагрэсіруе, ёсць яго каля 1600 мутацый, узбуйненае выдзяляннe слізі затыкае шляхі пранікання ў арганізм іншых рэчываў. Ён праяўляецца ў розным узросце, напрыклад, у лютым Зузю заатакавалі паліпы і трэба было яе тры гадзіны аперыраваць; мы вельмі ўдзячны беластоцкім лекарам, якія гэтую аперацыю выканалі.

Мы хочам, каб нас бачылі, мы хочам быць накшталт іконы. Калі ікона вісіць дома, і ніхто перад ёю не моліцца, яна выконвае ролю музейнага экспаната. А калі перад іконай гарыць лампада і мы перад ёю молімся, гаворым з ёю. Бо трэба гаварыць, таму што слова з'яўляецца найлепшым лякарствам, найлепшым скальпелем. Ніякае лякарства без размовы, без слова, без павучэння, не будзе дзейнічаць, бо чалавек без чалавека не можа выжыць. І важна нам, каб мы сталі як ікона, перад якой гарыць лампада, і да якой людзі прыходзяць і кланяюцца нашым пакутам, пакутам нашых дзяцей.

Сёння мукавісцыдоз перасталі называць хваробай дзяцей. Калісь дзеці не дажывалі дарослага ўзросту, а сёння ён становіцца хваробай і дарослых людзей. Зараз тут, на Падляшшы, маем дзевятнаццаць дарослых хворых, якія штудзіруюць, жывуць. У Лапах жыве мужчына, якому звыш трыццаці гадоў, ён жанаты, мае дзяцей. Некаторыя гаварылі ягонай жонцы, што ў іх не будзе дзяцей, што ён хворы, што ён памрэ. А яна, жанчына глыбокай веры, даказала, што і хворы мукавісцыдозам можа мець дзяцей, можа жыць; у іх сын Аскар. Мы дружым з сабою, мы з'яўляемся такой вялікаю сям'ёю. Маем і праблемы, не ўсё нам магчыма, нехта нам памагае, а нехта і не, але так дзеецца ў кожнай сям'і. Мы просім дапамогі, але адначасна змагаемся і за тое, каб мукавісцыдоз перастаў быць г.зв. нямым крыкам.

— ***А колькі людзей у нашай акрузе, значыць у нашых двух ваяводствах, хварэе мукавісцыдозам?***

— У нашым Паўночна-ўсходнім аддзяленні MATIO хварэе 50 дзяцей і 19 дарослых, а ў Польшчы пад апекай нашай Фундацыі знаходзіцца пад паўтары тысячы асоб.

— ***А тое Хмялева, адкуль Вы прывезлі рэліквіі св. Іаана Кармянскага, дзе яно?***

— Гэта ў 70 кіламетрах ад пагранперахода ў Полаўцах, у напрамку Жабінкі. Там ёсць Праабражэнскі манастыр, на тэрыторыі якога стаіць царква Чанстахоўскай іконы Багародзіцы. І яны там моляцца.

— ***Тая царква праваслаўная?***

— Так, праваслаўная, наша. Там старац Серафім маліўся за нас, за нашу Зузю, за яе маліліся на Афоне, за яе моліцца цэлы свет. На сайце Зузі ёсць рубрыка „Фільмы", а там маё інтэрв'ю тэлеканалу Religia.tv; адтуль таксама можна шмат даведацца. А больш інфармацыі можна знайсці на сайце www.mukowiscydoza.pl.

Доля сям'і а. Андрэя Апольскага прывяла мне на думку долю біблейскага пакутніка Іова. Іовавы пакуты выпрабоўваюць ягоную веру, якой ён стойка трымаецца. Здаецца мне, што кожны з нас у кожную хвіліну праходзіць праверку сваёй веры, толькі гэты экзамен ставіць пытанні рознай ступені складанасці. І не ўсім ён пад сілу. Некаторым людзям даводзіцца цяжкая нагрузка, іншым лягчэйшая. Усялякае, аднак, выпрабаванне з'яўляецца свайго роду павучэннем, свайго роду асэнсаваннем таго феномена, які называем жыццём, Божым дарам. Мукавісцыдоз таксама выпрабоўвае нас, і вучыць.

У ваяводы

23 лютага ў Вармінска-Мазурскай ваяводскай управе ў Ольштыне адбылася сустрэча прысвечаная тамашнім нацыянальным меншасцям. Ваявода Мар'ян Падзеўскі на пачатку прывітаў прадстаўнікоў меншасцей і запрошаных гасцей. Пасля яго голас узяла ўпаўнаважаная вармінска-мазурскага ваяводы па справах нацыянальных меншасцей Іаанна Ванькоўска-Сабесяк. Сказала яна м.інш. пра вынікі перапісу насельніцтва дзесяцігадовай даўнасці, і зазначыла, што не ўсе тады назвалі сваю сапраўдную нацыянальнасць. Ацаніла яна, што на тэрыторыі Вармінска-Мазурскага ваяводства нацыянальныя меншасці налічваюць каля ста тысяч асоб. Найбольш там украінцаў, пасля ідуць немцы. Звярнула яна ўвагу, што ў папярэднім перапісе насельніцтва было дрэнна сканструяванае пытанне пра нацыянальнасць, якога людзі не разумелі і блыталі з грамадзянствам. Можа быць гэта таксама вынікам спадчыны па ПНР, калі тадышняя ўлада хацела бачыць Польшчу аднанацыянальнай. Сёння іншы час, а доказам гэтаму прадстаўнікі меншасцей на высокіх пасадах. Вармія і Мазуры гэта ўзорны ў маштабе краіны рэгіён, дзе меншасці жывуць у згодзе і не скачуць сабе да вачэй, як на Беласточчыне. Можа бярэцца гэта з таго, што ўсе, апрача нешматлікіх аўтахтонаў, прыехалі туды аднекуль. Тут людзі маюць за сабою рознае мінулае, розны жыццёвы досвед, але мусяць жыць побач сябе. У кожнага адно жыццё і трэба яго сэнсоўна пражыць. Меншасці, так як і большасць, жывуць тымі самымі праблемамі, усіх кранае, напрыклад, беспрацоўе.

Пасля гаварылі прадстаўнікі меншасцей. Я расказаў пра жыццё беларусаў у Польшчы, галоўным чынам засяроджваючыся на Беласточчыне.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Плянта

Па гарачых слядах

Марознай раніцай 16 лютага г.г. у Плянце (Нараўчанская гміна) вялікі сабака блукаў сабе па вуліцы і ўгледзеў другога сабачку. Моцны сабарно накінуўся на малога, пачаў яго душыць і грызці. Слабейшы бараніўся, вішчаў і енчыў. Ён слабеў з кожнай хвілінай. Вялікая жывёліна давай тузаць ды цягаць сабачку па вуліцы то за адну, то за другую лапу. Люта здзекаваўся.

У Плянце 5-6 заселеных дамоў, у тым ліку і ўласніцы сабакі-бестыі. Ніхто, аднак, не выйшаў з дому, каб раздзяліць сабак. Некаторыя прыглядаліся, як паволі канае слабейшы ды чакалі, каб хутчэй ужо быў канец яго мукам. Ці сэрцы некаторых плянтаўскіх жыхароў скаваў мароз? Яны ж такія бязлітасныя!

17 лютага ехаў я роварам і ўбачыў таго задушанага сабачку на снезе пад плотам. Проста жах. У некалькіх метрах — усяго праз вуліцу — за плотам і перад домам бегаў і пагрозліва брахаў той сабака-душыцель. Не быў прывязаны...

(яц)

Сесія Рады гміны ў Чаромсе

Тэкст і фота Уладзіміра СІДАРУКА

Выступленне віцэ-маршалка Валянціна Карыцкага

25 лютага 2011 года ў Чаромсе адбылася V сесія Рады гміны. Старшыня Рады Надзея Суліма адкрыла пасяджэнне і прывітала гасцей, сярод якіх былі м.інш. віцэ-маршалак Маршалкоўскай управы Валянцін Карыцкі, ваяводскі радны Мікалай Яноўскі, старшыня Рады павета Мікалай Міхалюк.

На сесіі нававыбраныя солтысы атрымалі пасведчанні, а гэтыя, што пакідалі пасаду — лісты з падзякай. Падзячныя пісьмы атрымалі Віктар Сцепанюк з Полаўцаў (37 гадоў заставаўся на пасадзе солтыса!), Галена Назарук з Вулькі Тэрахоўскай (27 гадоў), Раман Бішчук з Кузавы, Аляксей Ваўранюк з Апакі-Вялікай і Міхал Русін з Беразышчаў — па 8 гадоў. Двум першым, Віктару Сцепанюку і Галене Назарук за шматгадовую працу віцэ-маршалак Карыцкі ўручыў падарункі. Ад імя ўзнагароджаных слова ўзяла Галена Назарук:

— Салтысоўства прыняла я ў 1984 годзе ад сястры мужа — Аляксандры, а раней абавязкі выконваў мой цесць. Традыцыя, значыцца, у сям'і захоўвалася. Даўней у Вульцы быў адзін тэлефон. Праз вёску пралягаў брук. Але ў вёсцы працвітала сельская гаспадарка, развівалася жывёлагадоўля. Людзі мелі працу. Хоць многае перамянілася на лепшае, шмат што застаецца да выканання. Асноўная праблема — водаправод. Неабходна збудаваць дарогу ў Войнаўку. Лічу, што за гэта паклапоціцца мая наследніца, а дапаможа ёй гмінны самаўрад. Дзякую былому і цяперашняму войтам, сябрам радным і працаўнікам гміны за належнае супрацоўніцтва, ды жадаю ўсім моцнага здароўя і поспехаў у працы.

Яўгенія Верамчук з Гміннага асяродка сацыяльнай дапамогі пазнаёміла ўдзельнікаў са справаздачай камісіі па вырашанні алкагольных праблем. Затым былі інтэрпеляцыі радных. Раман Туркевіч пытаў пра будову дзіцячага садка. Ежы Сцяхура крануў праблему мадэрнізацыі вуліц Бочнай і Фабрычнай. Прамоўца адзначыў, што ў час дажджавога надвор'я вада заліває асфальтнае палатно, бо выканаўца не зрабіў водаадліва, хоць у тэхнічнай дакументацыі такі прадугледжваўся. Радны прапанаваў прымусіць выканаўцу выправіць шкоду. Радны Мікалай Самасюк вынес прапанову заканчэння асфальтавання вуліцы Дзібуа ад воданапорнай вежы да чыгуначнага пераезда на дарозе Кузава — Чаромха-Вёска. Раман Туркевіч пытаў яшчэ, ці будзе пракладзена каналізацыя па вуліцы Дзібуа.

У бягучых справах Данута Грыгарук з Кузавы скардзілася на чыгуначны транспарт.

— На чым дабірацца дамоў чыгуначнікам пасля дзённай службы з Беластока ў напрамку Чаромхі? — пытала прадстаўнікоў Маршалкоўскай управы. — Апошні цягнік адпраўляецца ў 15:51. Аўтобусаў няма, ды, каб і былі, трэба плаціць нармальны білет. А кожны чыгуначнік выкупляе ільготы на сваім прадпрыемстве. Дарэмна трацім грошы...

— Разумеем праблемы чыгуначнага транспарту, — сказаў віцэ-маршалак Валянцін Карыцкі, — але на сённяшні дзень не абяцаю, што прыкінем дадатковы цягнік на лінію Чаромха — Беласток. Не стае грошай. Намагаемся па меры магчымасці скарэктаваць актуальны расклад язды. Ад 1 сакавіка прадбачваецца ранейшы прыезд цягніка з Гайнаўкі ў Чаромху перад восьмай раніцы. Вырашае гэта праблему даезду на працу і ў школы гайнаўскім настаўнікам. На этапе пагадненняў знаходзіцца справа пазнейшага ад'езду цягніка з Беластока ў Чаромху пасля 16-й гадзіны. Большай карэляцыі цягнікоў з аўтобусным транспартам можна спадзявацца пасля камуналізацыі прадпрыемства ПКС. Калі ў распараджэнні Маршалкоўскай управы апынецца чыгуначны і аўтобусны транспарт, тады можна будзе наладзіць належныя спалучэнні ў руху...

Надзея Суліма прапанавала дастасаваць актуальны расклад язды да патрэб лакальнай грамадскасці, а перш за ўсё студэнтаў і школьнай моладзі, пражываючых пры чыгунцы ад Седльцаў па Беласток.

Віцэ-маршалак Валянцін Карыцкі ўручае падарункі заслужаным солтысам

Чарговы голас у дыскусіі ўзяў ваяводскі радны Мікалай Яноўскі. Падзякаваў ён чарамшанам за падтрымку яго кандыдатуры на раднага ў час самаўрадавых выбараў у Сеймік Падляшскага ваяводства.

— Чаромха павінна гаварыць адным голасам, — заявіў радны Яноўскі. — На сённяшнім пасяджэнні прыкмячаецца рознагалоссе ў пастулатах. Так не можа быць. Ідзем у добрым напрамку. Неўзабаве пачнецца разбудова пагранперахода ў Полаўцах. Рушыць Ікея. Гэта шанц маладым уладкавацца на працу. Калі моладзь раней пакідала бацькоўскі кут і вандравала ў пошуках працы, цяпер гэтыя ж людзі будуць вяртацца дамоў. Не змарнуйма шанцу. Цяперашняя палітыка кіруючых краінай партый раздзяляе грамадскасць. Два гады таму Рэспубліка Беларусь прапанавала падпісанне пагаднення аб малым памежным руху. Польскі бок памяркоўна ставіўся да гэтай справы. Зараз наадварот усё маецца. Калі мы справу хочам паскорыць, не хапае подпісу Аляксандра Рыгоравіча...

Радны Славамір Беразовіч крануў праблему ваяводскай дарогі Кляшчэлі — Гайнаўка:

— Маставая ў незайздросным стане. Патрабуе мадэрнізацыі. Дарога вузкая, небяспечная...

Радны Сяргей Смык:

— Чаромхаўскі вакзал пусцее, нявыкарыстаны. Чыгуначныя ўстановы бадзяюцца быццам бяздомныя па прыватных кватэрах. Людзі церпяць. Ці так быць павінна ў рыначнай эканоміцы і ў дзяржаве права?..

Віцэ-маршалак Валянцін Карыцкі:

— Польскія чыгуначныя лініі і Рэгіянальныя перавозы — манапалісты. Тут дзейнічае прынцып рыначнай эканомікі. Нічога не зробім...

У гэтай частцы сесіі ставілася справа неадпаведных паводзін працаўнікоў Прадрыемства камунальных паслуг у Гайнаўцы. Солтысы скардзіліся, што рабочыя пры забіранні смецця пакідаюць фактуры абы-дзе, з-за чаго гаспадары маюць праблемы з аплатай належнасці. Спадар Пушкарэвіч з Апакі-Вялікай, напрыклад, прасіў прысутнае на пасяджэнні кіраўніцтва гайнаўскіх камунальнікаў, каб абавязалі работнікаў браць аплату пры вывазцы нечыстотаў.

— У нас няма пошты, — аргументаваў. — Не карыстаемся інтэрнэтам. Калі не заплацім працаўніку прадпрыемства, тады мы вымушаны ехаць 10 кіламетраў у Чаромху, каб аплаціць фактуру.

Апацкі солтыс гаварыў пра неабходны рамонт дарогі Чаромха — Апака — Гайнаўка, паколькі восенню ды вясною ніякім транспартам нельга тудою праехаць. Сапраўднае бяздонне. Солтыс Пагулянкі Алеся Храмінская пытала, калі будзе водаправод у іх вёсцы, а Пятро Сцепанюк з Полаўцаў крануў справу меліярацыйных равоў на сенажацях, якіх ніхто не ачышчае. У час ліўняў сенажаці апынаюцца пад вадою...

У адказ на інтэрпеляцыі войт сказаў, што будова садка ў Чаромсе не прадбачваецца, а працяг афальтавання вуліцы Дзібуа ў гэтым годзе не планаваны, але не абазначае гэта, што ў пазнейшым часе гэтай інвестыцыі не будзе.

Радныя прынялі праект Гміннай праграмы прафілактыкі і вырашання алкагольных праблем, змянілі рашэнне аб стаўках падатку ад маёмасці. Адмоўна выказаліся наконт перадачы грунтаў Кляшчэлеўскай гміне, якія знаходзяцца на тэрыторыі салэцтва Рэпчычы.

Злева: Уладзіслаў і Галіна Петрукі, Юры Хмялеўскі

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

ГАЛЕРЭЯ Ў ГАРАДКУ

Адкрыццё выстаўкі прац Уладзіслава Петрука інаўгуравала дзейнасць Гарадоцкай мастацкай галерэі. Вернісаж 5 сакавіка аздобіў канцэрт з нагоды Дня жанчын, у час якога выступілі калектывы Гміннага цэнтра культуры, што прынялі былі ўдзел у апошнім Фестывалі беларускай песні. Згодна з планамі дырэктара ГЦК Юрыя Хмялеўскага, новыя выставы ў галерэі будуць адкрывацца кожныя два-тры месяцы:

— Ідэя стварэння галерэі нарадзілася ў час рамонту нашага ГЦК. У адным з адрамантаваных памяшканняў рашылі мы паказваць творчасць аўтараў пражываючых на нашай тэрыторыі, ды не толькі, таксама іншых зацікаўленых выстаўляннем тут сваіх прац, а якія жывуць у краіне, а нават за мяжой. Маем ужо падрыхтаваны план мінімум на два гады. Хочам арганізаваць выставы па меры магчымасцей вельмі прафесійна. Гарадоцкая зямля славутая тым, што жывуць тут знакамітыя мастакі, такія як жывапісец Лявон Тарасэвіч ці малады фатограф Павел Гжэсь. Нядаўна паявіўся ў нас, як жыхар гэтай зямлі, Уладзіслаў Петрук. Пражывае ён пастаянна ў Каралёвым Мосце, хоць родам ён з Нароек, што каля Сямятыч.

Сярод аўтараў, працы якіх з'явяцца ў галерэі, будзе знакаміты мясцовы фатограф Ян Бочка, які пасля гадоў непрысутнасці вярнуўся ў Гарадок і нанова па-мастацку адкрывае родную зямлю.

— Будзем зацікаўлены таксама прэзентацыяй шырэйшага кола асоб. Хочам паказваць жывапіс, графіку, фатаграфію, можа скульптуру, таксама карыстаючыся кантактамі Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку і іншых галерэй.

Юры Хмялеўскі разлічвае таксама:

— Маю надзею, што ўдасца нам, каб свае працы паказаў у галерэі і Лявон Тарасэвіч. Мусім, аднак, пачакаць, бо вельмі шмат у яго працы і ён моцна заняты два бліжэйшыя гады. Абяцаў ён, аднак, што пакажа тут свае працы і вельмі яму на гэтым залежыць. Маем таксама планы, каб у рамках галерэі паставіць макеты нашых гістарычных будынкаў, якіх ужо няма. Да прэзентацыі вынікаў гэтага праекта дойдзе, мабыць, у наступным годзе.

На вернісаж каля дваццаці алейных пейзажаў і карцін кветак ды графік, прадстаўляючых аб'екты архітэктуры і натуры Беласточчыны (не хапіла гэтых з ваколіц Гарадка!) з'явіліся дзесяткі вельмі элегантна апранутых жыхароў Гарадоцкай гміны. Аўтар выставы, які закончыў Мастацкі ліцэй у Супраслі і факультэт графікі і кніжнай графікі ў Лейпцыгу (Нямеччына) сказаў „Ніве":

— Я не хацеў тут паказваць прац з Гарадка, бо яны вісяць у калідоры ў Гміннай управе і быў бы гэта паўтор. Гэтай прыгожай архітэктуры на Гарадоцкай зямлі ўжо вельмі мала. Трэба папахадзіць, папаездзіць, каб адкрыць штосьці незвычайнае.

У час вернісажу адзначыў, успамінаючы аб сваім майстэрстве:

— Нецярплівасць шкодзіць у творчай працы. Патрэбная сістэматычнасць.

Адна з наведвальніц выставы прызналася:

— Мы прыйшлі на адкрыццё выставы, каб адарвацца ад хатніх спраў. Апрача таго пан Петрук ужо наш, ён жыхар нашай зямлі, а я яго карцін раней не бачыла.

Іншая адзначыла:

— Ведаю, што ў шмат каго з нашай гміны ёсць ужо ягоныя рысункі. Карыстаюцца яны ў нас вялікім інтарэсам і прыносяць славу Гарадоцкай зямлі.

Яўгенія Матыс, адна з заснавальніц мастацкага калектыву „Асенні ліст":

— Вельмі важна, каб паказваць культуру нашай малой айчыны, а такую рэкамендуе спадар Петрук.

Рамонт фешэнебельна выглядаючага будынка ГЦК завершаны ў канцы мінулага года. Ужо ў студзені адбыліся тут вялікія мастацкія мерапрыемствы, між іншым, звязаныя з Вялікім аркестрам святочнай дапамогі, і вечар калядак гурту „Ilo&Friends" ды мясцовага найстарэйшага калектыву „Расспяваны Гарадок". Сёлета ГЦК зноў мае намер сарганізаваць славутыя ў рэгіёне мерапрыемствы такія, як Купалле, Сяброўская бяседа ці Дажынкі. Дырэктар Хмялеўскі:

— У планах маем арганізацаю музычных майстар-класаў і юбілею мясцовай газеты, якая будзе адзначаць пятнаццацігоддзе сваёй дзейнасці. У рэдка якой гміны ёсць свой часопіс, а ў нас ужо здаўна выходзіць штомесячнік выдаваны якраз ГЦК.

У па-сучаснаму абсталяванай глядзельнай зале Цэнтра больш за дзвесце месц для гледачоў. Ёсць тут таксама актавы зал і бібліятэка на паверсе. Туалеты — аб чым не заўсёды памятаюць пры рамонтах — прыстасаваныя для інвалідаў. У калідоры зараз ля ўваходу вісіць старая табліца з інфармацыяй, што ГЦК носіць імя Кастуся Каліноўскага:

— Тут, у гэтым асяродку культуры, вялікую вагу прывязваем да традыцыі і культуры. Аб'ект быў узведзены ў 1965 годзе і адразу атрымаў ён імя Кастуся Каліноўскага. Яшчэ ў час рамонту я вельмі дбаў аб тое, каб табліца з ягоным імем, якая вісела на будынку, засталася, а ГЦК надалей ганарыўся яго імем.

Масленіца ў Нарве

Пастаноўка масленіцы, выступленні калектываў мясцовага цэнтра культуры ды калектыву „Крыўчанкі" прыцягнулі ў пажарнае дэпо ў Нарве тлумы. — Я чатыры гады таму стала дырэктарам Гміннага цэнтра культуры ў Нарве і першым мерапрыемствам, якое мы сарганізавалі, быў „Багаты вечар". Задумалі мы зрабіць цэлы цыкл сустрэч, які ахапіў бы традыцыі нашай тэрыторыі. Знайшлі для яго супольную назву: „Жыве яшчэ традыцыя", — сказала нам у час імпрэзы дырэктарка нарваўскага ГЦК Тамара Юшкевіч.

„Масленіца" гэта ўжо дзевятая імпрэза гэтага цыкла.

— Залежыць мне на гэтым, каб нашы дзеці і моладзь памяталі звычаі, традыцыі, абрады нашых дзядоў і бацькоў, — распавядала пані дырэктар. — У сапраўднасці шмат з іх нават я ўжо не памятаю. Справа ў тым, каб маладыя людзі ўсвядомілі сабе, што калісьці іх дзяды, прадзеды супольна сустракаліся. Не цікавіла іх, што хтосьці багаты ці бедны. Сустракаліся выключна для таго, каб павесяліцца: паспяваць, патанцаваць. У выпадку масленіцы — каб падрыхтавацца да Вялікага посту. У апошнім тыдні перад постам мусім набрацца пакорлівасці. Я хацела б, каб наша моладзь пазбылася благіх звычак — зайздрасці, дурноты, нянавісці, каб не забывалася пра тое, што найважнейшае — пра згоду, сяброўства, любоў.

Нарваўскі цэнтр культуры ў рамках згаданага мерапрыемства прадставіў усе тры калектывы, якія ў ім дзейнічаюць. Былі выступленні маладзейшага і старэйшага вакальных ансамбляў і групы „Пэрла" з шасці дзяўчатак (вучаніцы гімназіі і ліцэя), якая існуе ад верасня мінулага года, адна з вакалістак якога Магда Бобік вяла сустрэчу:

— У нашым рэгіёне ўсе стараемся перадаваць традыцыі з пакалення ў пакаленне. Даведваемся аб іх многа ад нашых дзядоў, але і са школы. Як вядома, у цяперашні час традыцыя знікае, ды мы хочам яе працягваць. Масленіца для нас асабліва важная, таму што з'яўляецца падрыхтоўкай да Вялікага посту.

Галоўным пунктам імпрэзы была сцэнка, якая паказвала звычай адзначання масленіцы, падрыхтаваная мясцовымі дзецьмі і моладдзю. У яе падрыхтоўку — дарэчы, як і ў іншыя вечары з цыкла „Жыве яшчэ традыцыя" — ангажуецца настаўніца беларускай мовы з Нарвы Ніна Абрамюк. Сказала яна ў размове з намі:

— У сцэнцы выступаюць старэйшыя дзеці з гімназіі, толькі меншыя ролі іграюць дзеці з пачатковай школы. Падрыхтоўка сцэнак, звязаных з традыцыяй, нялёгкая, бо дзеці хочуць, каб усё было жартаўлівае і смешнае, а не заўсёды гэта магчыма. Моладзі і дзецям лепш іграецца ў сцэнках са штодзённага жыцця. Прыходзіцца мне самой выдумляць і пісаць ды рыхтаваць тыя сцэнкі, ды чаго ж не робіцца для вучняў!

Аб традыцыі масленіцы адзначыла:

— Масленіца гэта стары славянскі звычай. Моладзь збіралася, каб прагнаць злую зіму. Важ-

працяг ☞11

Ольштынскі хор у Гродне

Пра Яна Палавянюка пісаў я ў 1993 годзе. З таго часу мінула васемнаццаць гадоў, пастарэлі мы крышку, за гэтыя гады я бачыўся з ім толькі ў царкве, бо кожны з нас жыве сваімі справамі. Цяпер хачу напісаць пра яго зноў, што ён, бялышчанін, не забыў свайго роднага, сваёй мовы і культуры.

Ян Палавянюк мае ўжо вучонае званне доктара і з'яўляецца прадэканам Аддзялення мастацтва Вармінска-Мазурскага ўніверсітэта, вядзе Акадэмічны хор „Bel Canto" Вышэйшай школы інфарматыкі і эканоміі ў Ольштыне. Хор гэты выступаў на X Міжнародным фестывалі царкоўнай музыкі „Каложскі благавест", які штогоду адбываецца ў лютым у Гродне. Гэтае чатырохдзённае музычнае мерапрыемства з'яўляецца найважнейшым ва Усходняй Еўропе фестывалем харавой царкоўнай музыкі. Сёлета выступіла там пяцьдзесят хароў з Беларусі, Расіі, Украіны, Літвы, Латвіі, Сербіі, Румыніі, Славакіі і Польшчы. Іх выступленні ацэньвала міжнароднае журы з адзінаццаці чалавек. У катэгорыі акадэмічных хароў хор „Bel Canto" стаў лаўрэатам трэцяй узнагароды. За пятнаццацігадовую гісторыю хору гэта ўжо дваццаць сёмая ўзнагарода, а гродзенскі фестываль быў дваццаць першым музычным мерапрыемствам, у якім ольштынскі хор удзельнічаў.

Хор „Bel Canto" гэта адзін з нямногіх хароў, які апрача тыповай польскай і замежнай харавой музыкі розных стыляў і эпох, выконвае таксама багатую палітру царкоўнай музыкі. Хор чатыры разы станавіўся лаўрэатам царкоўных фестываляў у Гайнаўцы і Беластоку. У ягоным рэпертуары м.інш. Літургія Іаана Златавуста тв. 41 Пятра Чайкоўскага, якая была выканана ў канцэртнай зале Падляшскай оперы і філармоніі ў Беластоку. Канцэрт быў запісаны на пласцінкі Фондам царкоўнай музыкі, які арганізуе міжнародныя фестывалі царкоўнай музыкі „Гайнаўка". Гродзенскі фестываль пацвердзіў высокае выканаўчае майстэрства ольштынскіх харыстаў у галіне царкоўнага песнапення.

Андрэй ГАЎРЫЛЮК

Кафедра беларускай культуры
Філалагічны факультэт Універсітэта ў Беластоку запрашае на

Беларускія чацвяргі інтэрдысцыплінарны канверсаторый

праф. **Люцына Александровіч-Пэндіх**, д-р Святляна Словік

Язэп Найдзюк і ягоная гісторыя Беларусі „Paznavajma historyju biełaruskaha narodu"

24 сакавіка, пачатак у 17.00, вул. Лінярскага 3, зала 1Б

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

Найбольшым магнітам аказаліся... хлопцы!

З вучаніцамі другога „ц” класа, што ў беластоцкай „чацвёрцы”, мы сустрэліся яшчэ ў цэнтры Беластока. Адтуль мы разам на гарадскім аўтобусе дабіраліся ў квартал ТБС, што ў другім канцы горада. Туды менавіта пераходзіць працаваць Пачатковая школа № 12, якая стаіць яшчэ *адной нагой* у старым месцы па вуліцы *Варынскага*. Тры гады запар там ладзілі Фестываль культур, а 4 сакавіка г.г. гэтае прэстыжнае свята арганізавалі ўжо ў новым будынку па вуліцы *Камісіі нацыянальнай адукацыі 1 А*.

— Ці адчуваеце хваляванне перад выступленнем, — пытаю ў вясёлай кампаніі?

— Нееееееееееее!

— Ім найбольш спадабалася, што будзем ехаць на гарадскім аўтобусе, — кажа настаўніца Аліна Ваўранюк. — Многія з іх упершыню будуць ехаць *эмпэкам!*

Выхаванцы беларускага садка і ПШ № 4 аж гараць, каб выступаць на школьных і гарадскіх мерапрыемствах. Сёння падрыхтавалі яны беларускія вершы і песні, якія адважна і прыгожа прадставяць сваім равеснікам, старэйшым сябрам, іх апекунам і настаўнікам.

* * *

На Фестываль культур у Беластоку заўсёды прыязджаюць дзеці з Гарадка. І сёння яны прывезлі з сабой польска-беларускую пастаноўку. П’есу, спецыяльна пад мерапрыемства, напісала іх настаўніца Тамара Бялькевіч. Тры адважныя акцёркі: Соня Ніна Сульжык, Габрыся Нічыпарук і Кася Грыка распавядалі пра атракцыёны беластоцкага фестывалю. Цікава, што найбольшым *магнітам* дзяўчаткам аказаліся прыгожыя... хлопцы!

Гарадоцкія сябры прывезлі таксама беларускі стол. На ім мы пабачылі масленічныя смакоцці: аладкі, бліны, булачкі і сырнікі. Стравы былі падпісаны па-беларуску!

І вокамгненна зніклі са стала.

— Вы самі пяклі і смажылі бліны і аладкі? — пытаю ў гарадоцкіх сяброў.

— Не, гэта бацькі пастараліся, — чую ў адказ, — значыць, матулі!

* * *

Яшчэ да таго як завітаем у актавую залу, дзе адбываліся выступленні, мы пазнаёмімся з прадстаўнікамі школы № 50 у Беластоку (што ў квартале *Новае Места*). Яны арганізавалі стэнд з беларускімі кніжкамі, вышыванкамі і традыцыйнымі стравамі.

— Беларуская культура нам па душы, — кажа апякунка Ганна Цыркун.

Словы настаўніцы Божага закону красамоўна пацвердзіць іх выступленне. Нашы сябры загукалі на поўныя грудзі песні *Купалінка* і *Палюбіла я яго*, ды малітоўна праспявалі фрагмент акафіста *Да святога дзіцяткі Гаўрыіла*.

— А адкуль вы дасталі аўсяны кісель? — пытаю пра далікатэс выстаўлены ў іх стэндзе.

— Кісель аж з Рагачоў прыехаў, — кажа спадарыня Ганна, — аж ад Мілейчыч. Яго зварыла мая цёшча, спецыяльна пад фестываль!

* * *

На фестывалі сярод ганаровых гасцей мы сустрэлі паэта Віктара Шведа. Паэт ад гадоў сябруе з вучнямі і настаўнікамі ПШ № 12. Сёння таксама ў яго гонар быў прадэкламаваны вучаніцай гэтай школы беларускі твор *Беласточчына*.

— Мы вельмі рады, што спадар Віктар Швед прымае запрашэнні на нашы мерапрыемствы, — кажа Яўгенія Пятрышык, ініцыятарка аўтарскіх сустрэч з беларускім паэтам.

Мы пацікавіліся паводле якога ключа арганізатары фестывалю падбіраюць выступоўцаў.

— Інфармацыю пра мерапрыемства высылаем у школы і культурныя цэнтры. Тыя, што заяўляюць ахвоту выступіць, прыязджаюць да нас.

Сёлета з нацыянальных меншасцяў, апрача беларусаў, выступілі яшчэ ўкраінцы. Іншыя культуры — яўрэйская, індуская, руская — прадстаўлялі палякі. Паказалі яны таксама шырокую музычную праграму пра адметнасць Курпяў і Сувальшчыны.

Цікава, што беларускія і ўкраінскія выступленні дзяцей успрымаліся не як індуская экзотыка, а як сваё! На гэта спрацавала атмасфера фестывалю, дзе ўсе маладыя спевакі, музыканты, мастакі і дэкламатары адчувалі сябе як у вялікай і прыгожай сям’і.

Фота і тэкст ГАННЫ КАНДРАЦЮК

Усё праз чмяля

Ці ведаеце вы, што людзі маглі б жыць вечна? Неўміручасць амаль што падаравала нам маленькая птушачка. Напэўна мне не верыце, але гэта чыстая праўда. Зараз вам пра гэта раскажу. Паслухайце.

Усё здарылася ў далёкай Манголіі. Даўным-даўно малая ластаўка з вялікім і высакародным сэрцам знайшла паток вечнага жыцця. Той, хто піў з яго ваду — рабіўся неўміручым. Птушка адразу падумала, што аднясе „вечнасць” сваім сябрам — людзям. Узяла некалькі кропель вады ў сваю малюсенькую дзюбку і накіравалася да людзей. Раптам з-за кустоў з’явіўся вялікі і тоўсты чмель. Грубы па сваім характары, ён кальнуў ластаўку ў крыло. Птушка аж піскнула ад болю. Вада ў той момант выляцела з яе дзюбкі. Кроплі ўпалі на елку, сасну і кедр. З тых часоў гэтыя дрэвы сталі вечна зялёнымі — неўміручымі. Ластаўка, каб адпомсціць чмялю, злавіла яго і дзюбнула ў горла. І такім чынам чмель перастаў спяваць. Цяпер у выніку пакарання ён толькі голасна гудзе.

http://trht.org

Чмель мае сваю вечную кару, але людзі страцілі больш. А, магчыма, і добра, што ўсё так закончылася.

Віялета НІКІЦЮК-ПЭРКОЎСКАЯ

На Саракі не сунься да ракі!

(з народнага календара)

22 сакавіка, ***Сорак пакутнікаў*** або па-народнаму ***Саракі***. У народзе верылі, што на Саракі сарока пачынае віць гняздо і прыносіць на яго сорак пруткоў. Раніцай, перад усходам сонца, хлопцы стараліся перакінуць праз страху 40 трэсак — калі гэта ўдасца, летам будуць знаходзіць птушыныя гнёзды. Дзяўчаты пераломвалі 40 дошак і перарывалі 40 вяровачак або шнуркоў. Такі жэст меў дапамагчы надыходу цяпла ды абудзіць ад зімовага сну дрымучую прыроду. Дзе-нідзе верылі, што ў Саракі прылятае 40 жаўранкаў, таму гаспадыні выпякалі з цеста „жаваранкі” і давалі іх дзеткам. У адзін піражок яны ўкладалі манетку. Той, хто атрымаў такі *жаўранак*, лічыўся шчаслівым. На Сорак Пакутнікаў вельмі пільна сачылі за надвор’ем. Калі ў гэты дзень здарыўся мароз, людзі верылі, што да вясны будзе яшчэ 40 маразоў. Калі ад Грамніц па Саракі не было адлігі і не псаваліся дарогі — у лета чакай засухі. Калі на страсе ляжаў снег, ён будзе пакрываць зямлю па Благавешчанне і часткова ўтрымаецца аж па Юр’я. Калі са стрэх накапала столькі вады, што можа напіцца вол — будзе добрая вясна. У гэты час пачыналася разводдзе, таму людзі гаварылі: *На Саракі не сунься да ракі!*

У Шумілінскім раёне прыладжвалі арэлі і абавязкова гушкаліся — каб улетку не кусалі камары.

ЗОРКА

Сакавік

Міра ЛУКША

Вольна вецер вее на прасторы,
з выраю дамоў нясуцца птахі.
Неўзабаве загамоніць хорам
ўся прырода ў вясновых апранахах.
Забяжыць і ў душы цёплае праменне,
радасць свята ў высі залунае.
І з сакавіком і мы адродзімся, і зменім
бляклыя сцягі, падымем па-над краем.

Музыка з кайфам

Як робяць кар'еру „The Toobes"?

— Як зрабіць кар'еру?

— Трэба вельмі шмат працаваць і не ленавацца. Трэба таксама верыць. І марыць пра вялікую будучыню.

— А вы ўжо зрабілі кар'еру?

— Мы яшчэ на прыступках, гэта першая ступень у неба!

— Дапамаглі вам прыхільныя рэцэнзіі ад брытанскага прадзюсера і музыка Трыкі (Tricky — сапраўднае прозвішча: Adrian Thaws)?

— Быў моцны рэзананс, але Трыкі ўжо за мяжой і зараз няздольны зрабіць нешта, каб нам дапамагчы.

— Падняліся пасля гэтага ганарару?

— Падняліся. Мы ведаем вартасць нашай працы, а кожны дзень шмат працуем. Ды яшчэ любім адзін аднаго.

— Класныя галасы звязаныя з вашым новым кліпам.

— Кліп гэта *handmade* відэа. Шмат круцілі ў час паездак, а пасля проста выразалі, што падыходзіла да ідэі. Ён перш за ўсё вельмі пазітыўны і таму многім спадабаўся. Чулі мы ад людзей, што ён вельмі летні па настроі.

http://www.a1tv.ru

Дарэчы, неўзабаве першы дзень вясны, з якім усіх віншуем.

— А як ставіцеся да іншых беларускіх музыкаў?

— Мы лаяльныя. Падабаюцца нам усе і ніхто. Але сябруем сапраўды з многімі, а яны, таксама як і мы, імкнуцца ўверх.

— У мінулым годзе паявіліся супярэчнасці, звязаныя з вашым прыездам на фестываль „Басовішча"...

— Не атрымалася. Здаецца, недамоўленасці, звязаныя з тэрмінам, пераважылі, але з задавальненнем прылютна новыя „Тубсы", новыя старыя „Тубсы". За гэты перыяд „выраслі нам яйцы" і трэба ўсім іх паказаць, таму чакайце рэвалюцыі.

— Адкуль назва „The Toobes"? Такая небеларуская.

— „Toobes" гэта проста біт: тубс, тубс, тубс.

— Вашы мэты?

— Займацца любімай дзейнасцю, заўсёды, ніколі ад гэтага не адступаць, атрымліваць ад гэтага задавальненне. Падарожнічаць.

i_basovka@o2.pl

ЧАРОМХА: МОЦ ЛЕСУ І СТАРЫХ ПЕСЕНЬ!

— Калі спяваю старыя песні, адчуваю радасць, — кажа Ілона Нестаровіч з Чаромхі. — І такое пачуццё сілы, рашучасці...

Хто з нас не ведае музычнага гурту „Чарамшына"? Гэта свайго роду візітная картачка не толькі Чаромхі, але і ўсяго Падляшша. У іх песнях спалучаюцца беларускія, украінскія, польскія, расейскія мовы, мелодыі, інструменты. Пад уплывам „Чарамшыны" ўзнікла ў Чаромсе моладзевая музычная група „Гілочка" (па беларуску: *галінка*, па-падляшску: *гулька*). І Ілона, з якой сустракаемся на ўроках беларускай мовы, спявае ў гэтым калектыве. Дзякуючы старым песням, пачала цікавіцца роднай мовай і гісторыяй сям'і, якая выводзіцца са славутай Орлі. І разумець, што веданне сваёй мовы дапамагае, а не мяшае ў жыцці!

Усе навучэнцы беларускай мовы ў Чаромсе любяць гуляць у тэатр. Нашы сябры, разам з вучнямі другога, трэцяга і чацвёртага класаў ставілі п'есу „Пра Піліпку сынка і ведзьму". Каб дапасаваць сцэнарый да характараў акцёраў, настаўніца Альжбета Раманчук падзяліла ролю злой *ведзьмы* на двух хлапчукоў. Адзін з іх быў *Бабай-Ягой*, другі яе катом *Гаргусем*. Чарадзейны дуэт выклікаў здзіўленне (гэтая роля чамусьці адведзена дзяўчатам!) і здаровы смех. Бо чаромхаўскія хлопцы ўсе спартсмены і ведаюць як супрацоўнічаць не сцэне.

Праўда, першае захапленне сярод навучэнцаў старэйшай групы ў Чаромсе — гэта ўрокі гісторыі! Дзякуючы ім усё пачалося...

— Раней гісторыі вучыла нас Альжбета Раманчук. А пасля, калі яе замяніла іншая настаўніца, мы не хацелі парываць з кантакту з нашай *няй*, бо мы вельмі яе палюбілі і прывыклі да яе. І, каб быць разам, запісаліся на беларускую мову, — апавядаюць нашы сябры.

Ад падарожжа ў Чаромху ў мяне асталася яшчэ такая экалагічная карціна. Кася Назарук і Эва Панасюк, якіх мы прадставілі ў *Галерэі Зоркі*, заявілі што хочуць у жыцці стаць лекарамі-ветэрынарамі і жыць там, дзе лес, многа дзікіх звяроў і цішыня. Іх мары падаліся мне натуральнымі і сугучнымі з нашай лясной зямелькай. Калі я ехала ў Чаромху — туды і назад — я налічыла аж 47 дзікіх казуль, два лісы і аднаго дзіка. Звяры хадзілі сабе як паны па заснежаных палях і, не зважаючы на машыны на дарозе, шукалі сабе корму.

Польска-беларуская крыжаванка № 12

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 8:

Як, пуп, мякіш, мабілка, парад, лета, карова, кураня, хор, фон, жаба. Мір, марафон, сябра, кідок, кіл, вуха, шкляроб, ара, парасяты.

Узнагароды, запісныя кніжкі, выйгралі **Магдалена Ваўранюк, Наталля Тамчук, Мартына Швед, Дыяна Галёнка, Юліта Данільчук, Дамініка Юрковіч, Віялета Дработка, Паўліна Паплаўская** з Бельска-Падляшскага, **Юстына Вакулюк** з Арэшкава. Віншуем!



(Не)шчаслівая трынаццатка

Анатоль ПАРЭМБСКІ

Лёс нашай беларускай зямлі быў ад вякоў цяжкі і залежны ад уладароў, прыхільнасцю якіх наш народ не можа пахваліцца. Пра лёс аднаго мужыка-беларуса хачу тут расказаць. Гэта лёс майго бацькі, а тое, што тут запішу, вядомае мне з расказу яго і яго старэйшага брата Аляксандра і з таго ўсяго, пра што сам добра помню. Буду старацца пераказаць верна ўсё перажытае, без ніякіх эмоцый. Дзе будзе не хапаць даты ці месяца здарэння, гэта значыць што гэтага не памятаю добра.

Назваў я гэты расказ „(Не)шчаслівая трынаццатка", таму што асоба, пра якую тут будзе гаворка, нарадзілася трынаццатага сакавіка.

Страшава — вёсачка паложана на пясчыстай зямлі, сярод багнаў на ўсход ад Гарадка. Жыхар Страшава Аляксей Парэмскі (Чыгаюк) каля 1880 г. бярэ шлюб у царкве ў Мастаўлянах з Магдаленай Крэйза са Скраблякоў. Неўзабаве прыходзяць на свет дзеці — сын Аляксандр, дачка Ульяна, сын Арсенік, сын Іван — мой бацька, пра якога і будзе далей гаворка. Родзяцца яшчэ сын Павел, дачка Дамініка, сын Грышка. Калі ўжо сын Грышка быў немалым падлеткам, памірае іх маці Магдалена. Аляксей бярэ другую жонку, з Зубкоў, з роду Бакер. З другой жонкай у Аляксея прыбывае яшчэ адно дзіця, дачка Марыя.

Маючы сямёра дзяцей, Магдалена і Аляксей думалі, каб хоць адно дзіця прыдзяліць Богу, гэта значыць прывесці ў сан духоўных. У сям'і Магдалены была адна асоба, якая скончыла духоўную акадэмію, але духоўным не стала. Гаварылі, што ў Пецярбургу стаў ён жулікам. Але гэты жулік быў у Пецярбургу на чыноўніцкай пасадзе да смерці. Можа мой сын будзе разумнейшы? — думала Магдалена.

Аляксей дагаварыўся, што бацюшка з Гарадка возьме на выхаванне аднаго хлопца і будзе яго адукаваць і пастараецца выслаць у духоўную школу. Бацюшка, агледзеўшы сыноў Магдалены і Аляксея, намеціў Івана (Ваньку). І так Ванька апынуўся ў гарадоцкага бацюшкі на плябаніі ў Барыку, дзе ён у тым часе жыў.

Аўтар за жнівамі

Прывыкаць Ваньку жыць на плябаніі, пад строгім парадкам, паміж чужых людзей было велмі цяжка і адчуваў ён там сябе дрэнна. У Страшаве была вялікая хата, усім месца хапала, быў вялікі падворак, збіралася многа дзяцей з вёскі, было дзе і кіем кідаць, а хата стаяла другая з канца вёскі, дык было вялікае раздолле. Ніхто дзяцей дакладна не пільнаваў. Заўсёды была вялікая свабода. А найважнейшае — заўсёды блізка была мама. Столькі Ванька меў у сваёй хаце абавязкаў, што вучыцца малітвы, а да гэтага дакладаўся ён шчыра і ведаў малітвы вельмі добра. У роднай хаце Ваньку хапала ўсяго.

Аляксей меў хоць слабой, але 16 гектараў зямлі і не лянаваўся дарабіць коньмі ў лесе, калі была такая нагода.

Да жыцця пад строгім парадкам прывыкаць было цяжка. Кожны дзень былі ўрокі чытання і пісання, чаго строга пільнавала гувернантка. Вучоба Ваньку не была цяжарам, але калі адыходзіла гувернантка, нагляд над ім брала не менш строгая выхавацелька. Столькі Ванька меў шчасця, што не меў праблемы з малітвай і дазвалялі яму паглядзець коней, калі работнік Алесь іх паіў, карміў, чысціў. Рэжым навучання быў суровы і Ванька цыклічна ездзіў здаваць экзамены да бацюшкі ў Мастаўляны.

Мама Ваньку наведвала вельмі рэдка. На частыя наведванні бацюшка не дазваляў. Казаў, што пасля адведзінаў Ванька тыдзень хварэе. Падчас адведзінаў Ванька распытваў пра сваіх сяброў і прасіўся ў мамы, каб яго хутчэй забралі дахаты. Найгорш было з развітаннем. Без вялікага плачу абодвух бакоў не абыходзілася. Бацька Аляксей часта адведваў свайго сына, але іх разлука на адведзінах не была такая балючая для Ванькі.

Калі Ванька падрос, дазволілі яму пасвіць быдла, чым ён быў вельмі задаволены, а з цягам часу стаў неабходным памочнікам Алеся, памагаў паіць, карміць і чысціць коней, а пасля навучыўся іх запрагаць.

Скончыўшы прыхадскую школу, Ванька пачаў навуку завочна ў семінарыі ў Свіслачы, куды здаваць экзамен ехаў з ім і сам бацюшка.

Выхавацелька і гувернантка былі надалей неадлучнымі спадарожніцамі Ванькавага жыцця. Бацюшка быў вельмі рады паводзінамі Ванькі, яго поспехамі ў вучобе і помачы ў гаспадарцы ды выйшаў з прапановай, каб Ванька адвозіў яго з Барыка, дзе жылі, у царкву ў Гарадок на ўсе патрэбы. Ванька адчуваў сябе дарослай і важнай асобай, давозіўшы бацюшку спецыяльнай павозкай і добрымі коньмі з месца пражывання ў Барыку ў царкву ў Гарадок і ў іншыя пазарэлігійныя месцы. Суадносіны паміж бацюшкам і Ванькам былі добрыя.

Падчас прабывання ў Гарадку, калі бацюшка быў заняты ў царкве, Ванька пазнаёміўся з многімі сябрамі. Гэтыя сябры добра прыдаліся ў далейшым жыцці. Быў гэта рэвалюцыйны 1905 год. У Гарадку і ваколіцы ўзнікалі падпольныя арганізацыі проціў царскай уладзе. Ванька даведаўся ад сяброў, што падпольнікі мяркуюць забіць бацюшку і сказаў яму пра гэта. Бацюшка не стаў начаваць у хаце і нават рэдка бываў у Барыку. Аднойчы ноччу падпольнікі прыйшлі ў Барык, але бацюшкі ў хаце не было. Праз пару дзён падпольнікаў арыштавалі і болей іх ніхто ніколі не бачыў. Пасля гэтага здарэння бацюшка трактаваў Ваньку як свайго прыяцеля.

Калі набліжаўся час канчаць навуку ў гімназіі, бацюшка спытаўся ў Ванькі, у якую хацеў бы паступіць духоўную навучальную ўстанову. Ванька не спяшаўся з адказам, але калі бацюшка штораз мацней націскаў, Ванька катэгарычна сказаў, што ў ніякую духоўную школу не думае выбірацца. З таго часу бацюшка не стаў вазіць Ваньку на экзамены ў гімназію ў Свіслачы. Не стала выхавацелькі і гувернанткі. Стаў Ванька простым работнікам, на шчасце яшчэ з правам вазіць бацюшку ў царкву на багаслужбу. Суадносіны паміж імі сталі халоднымі.

Ванька стаў ужо дарослым мужчынам. Меў добрых сяброў, мінш. жыда, які называўся Шмуль Шміт і, як абяцаў, што калі Ваньку не будзе месца на плябаніі, то ён пастараецца за работу і кватэру. Бацюшка, здаецца, не думаў Ванькі пазбыцца, бо дазваляў яму зарабляць коньмі на яго патрэбы, калі меў бы на гэта час. Давозіў Ванька тавар з Валіл-Станцыі ў Гарадок у яўрэйскія крамы. Але доўга гэта не трывала. Ванька скончыў 21 год жыцця і дастаў прызыў у царскую армію.

(Працяг будзе)

Мая вёска пусцее

Вёска Бялкі распаложана ў паўночна-заходняй частцы Нарваўскай гміны Гайнаўскага павета. Тут усе людзі былі і ёсць праваслаўнага веравызнання, апрача чатырох сем'яў, што сабе купілі дамы і прыязджаюць толькі ва ўікэнды, а пастаянна жывуць у Беластоку. Але яны зжыліся з жыхарамі вёскі і адны да адных адносяцца прыязна. Вёска займае 47 участкаў зямлі розных угоддзяў. Ворныя палеткі, сенажаці, паша і вялікая частка лесу — усяго 940 гектараў. Зямля тут слабая, пераважна V і VI класаў. Буйных гаспадароў у Бялках не было і няма. Пры санацыі вёска налічвала 92 дамы, як у нас называлі „дымы", а пражывала тут тады 469 асоб, была свая пачатковая школа. Калі ў 1939 годзе прыйшлі сюды саветы, адкрылі школу, у прыватным доме краму, „красны вугалок" — святліцу і рыхтавалі дрэва, каб паставіць лазню. Калгаса не заснавалі, на Сібір не вывезлі нікога, бо ў вёсцы не было гэтак званых „кулакоў". Людзей ганялі на лесазагатоўку і пастаўку каменя на пабудову лётнішча ў Заблудаве.

Калі ў 1941 годзе гітлераўская Нямеччына напала на Савецкі Саюз, пачаўся тэрор у вёсцы. Моладзь прымусова забіралі на работу ў Нямеччыну, забаранілі калоць вепрукоў, малоць збожжа ў жорнах і зноў адправілі на лесазагатоўку ў Жэдню, пастаўку каменя на баранавіцкую шашу ў ваколіцу Каралёвага Моста. Там у равах ляжала многа машын, танкаў і ў першыя дні зброі пакінутай адступаючай Чырвонай Арміяй. У час нямецкай акупацыі школы ў вёсцы не было. З Нямеччыны не вярнуліся з прымусовых работ 4 асобы — 3 мужчын і 1 жанчына.

Пасля вызвалення нашай тэрыторыі ў 1944 годзе — а гэта было ў дзень святога Антона Пячэрскага 23 ліпеня 1944 года — у нашай вёсцы запанавала тады радасць. Моладзь збіралася на лавачках, спявала песні, весялілася. Потым пачала вяртацца моладзь з прымусовых работ у Нямеччыне і зноў весяліліся ў вёсцы. Тады ў нас было многа моладзі — бывала, на якое-небудзь свята па тры і чатыры патанцоўкі было ў вёсцы. Самагонку гналі, пілі ды спявалі, як у народзе кажуць — „хоць голы, але вясёлы". Зараз пачалі ездзіць гэтак званыя агенты і сталі намаўляць праваслаўных жыхароў на перасяленне ў Савецкі Саюз на лёгкі хлеб і галубінае малако. З нашай вёскі выехала 19 сем'яў, пакінуўшы свае дамы, гаспадарчыя будынкі і абсеяныя палеткі. Усё гэта перайшло ў дзяржаўны фонд зямлі. Дзевяць сем'яў пабудавалі сабе дамы на беластоцкіх „высранках" і перабраліся туды на пастаяннае жыхарства. Многія пакуплялі пляцы ў Беластоку і там пабудавалі дамы сваім дзецям. У вёсцы зноў адкрылі чатырохкласную школу, якую пасля закрылі з-за недахопу вучняў. Цяпер з Бялок адно дзіця вучыцца ў сярэдняй школе ў Беластоку і адно дзіця давозяць у спецыяльную школу ў Беластоку.

Крама была адчынена ў прыватным памяшканні і пераводзілася з месца на месца некалькі разоў, аж пакуль Канстанцін Майсеня не пабудаваў прыгожую краму. Потым Гайнаўскі малочны камбінат пабудаваў мураваную прыгожую злеўню малака.

У Бялках дзейнічала буйная Добраахвотная пажарная каманда, цяпер ёсць толькі некалькі членаў-добраахвотнікаў, апошнія або адышлі ў вечнасць, або ўжо старэнькія пенсіянеры. Не стала ахвотных на прадаўца, дык закрылі краму. Вёска пастарэла, стала мала малака, дык закрылі малачарню, а хто астаўся, стаў пастаўляць малако ў Трасцянку. Некаторыя дзеці выбраліся ў Беласток, дык бацькі на дзяцей папераперасвалі гаспадаркі, а самі пайшлі на пенсію. Дзеткам сваім не перапісалі работы і самі цяпер, старыя, пайшлі ў одмаладзь і абрабляюць сваю зямлю. Калі настала салідарніцкая ўлада, то ўсё, што было пабудавана пры гэтак званай камуне, хоць яе ў нас не было, пачалі прадаваць за бясцэнак. Краму з пляцом прадалі за 600 злотых, а цяпер яна перайшла ў трэція рукі. Купіў яе жыхар ад Крушынян, пастаянна пражываючы ў Беластоку, на летнюю дачу і ўжо адрамантаваў. Малачарню купіла за 1 000 злотых управа Нарваўскай гміны і сёлета мае закончыць рамонт — перабудаваць яе на вясковую святліцу. Пажарныя прылады стуль перанеслі ў закуплены гмінай бляшаны гараж.

Цяпер у Бялках 51 хата, з таго ў 26 хатах пражывае 45 чалавек — 22 жанчыны і 23 мужчыны, з іх 9 пастаянна прапісаныя ў Беластоку. 25 хат зімою пустуюць, а на лета ў некаторыя хаты прыязджаюць дзеці, таксама ўжо пенсіянеры, і жывуць тут усё лета. Ёсць яшчэ чатырох сякіх-такіх гаспадароў, не пенсіянераў, што абрабляюць свае гаспадаркі. Малако ў малачарню пастаўляюць 3 гаспадары — адзін гэта солтыс вёскі і два пенсіянеры; умяшчальніка малака ў нас няма.

Ажывіць вёску было б вельмі цяжка, бо з 940 гектараў зямельных угоддзяў каля чвэрці засталося ў карыстанні вёскі, а апошнія перададзены як зямля з дзяржаўнага зямельнага фонду надлясніцтву Жэдня. Яно абсаджвае лесам і вырэзвае круглы год. Астаецца толькі галлё па калені — ужо нават цяжка прайсці па грыбы.

Мікалай ЛУК'ЯНЮК

Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Дарога

Фота з архіва Аляксандра ВЯРБІЦКАГА

Падарожжа з ляўкоўскіх хутароў у Сушчу на схіле 1960-х гадоў

Перад апошнімі самаўрадавымі выбарамі старшыня нашага ўрада заклікаў з мегаафішаў не рабіць палітыкі, толькі рабіць, напрыклад, дарогі. І неўзабаве пасля выбараў ягоны ўрад узяўся за гэтую работу. Узяўся за яе вельмі адказна і скрупулёзна, асабліва ж у нашай частцы краіны, называнай традыцыйна Польшчай Б. Бо тут, як здаўна вядома, народ вельмі гасцінны, асабліва для адсталасці і другаякаснасці і мабыць таму наш любімейшы ўрад рашыў дасяліць нам яшчэ і першаякаснасць. Без празмернай спешкі, а нават маестатычна, па-каралеўску мабыць тыя беластоцкія дарогі пралягуць перад намі аксамітным, як больш нідзе, насцілам. Толькі без спешкі, а то яшчэ тутэйшы народ, які гадамі рваўся ў Беласток, вырвецца па тых аксамітах у нейкую Варшаву і ніхто пасля на нашай крэсавай сцяне не астанецца. А трэба ўсё ж такі, каб і тут нейкі электарат астаўся, бо ж ён акурат цяпер паказвае вельмі правільныя палітычныя сімпатыі. І каб той электарат даверліва хадзіў у выбарчыя храмы і падаваў там бюлетэні „за здравіе" ласкава нам пануючых, веруючы, што ўзнагародай за гэта будзе светлая будучыня, нейкі рай, магчыма, што дакладна той жа самы рай, пра які апавяшчаюць нам вучоныя тэолагі.

Прычынай урадавых мер па адтэрміноўцы будовы нашых дарог стаў недахоп грошай на рэалізацыю ранейшых абяцанак. Паколькі тых бюджэтных грошай, як мне здаецца, з году ў год становіцца штораз менш, дык у гадах, на якія адтэрмінаваны будовы ваколбеластоцкіх новых дарог, іх будзе яшчэ менш і зноў трэба будзе іх адтэрміноўваць. І далей трэба будзе іх абяцаць. І тлумачыць, што droga jest droga.

Калісь дарогу называлі таксама гасцінцам, бо гэтакім шляхам прыязджалі госці. А госці ж — таксама дарагія. Такі колішні казак ад Дунаю, з вялікай дарогі, быў — як падае наш фальклор — госцем неацэнным. Ды і ў наш час каштоўнасць дарогі не меншая. Бо чаму вясковым дзяўчатам не хацелася выходзіць замуж за вясковых кавалераў? Бо такі хлопец не здалёк, толькі з такой жа вёскі, што і маладзіца. Значыць, не хацелася яму, гультаю, у далёкую дарогу за дзяўчынай падавацца. А якая за гультая захоча замуж выходзіць?

Зыгмунт Глогер прыводзіць меркаванне Кшыштафа Клюка, што пры каралі Станіславе Панятоўскім найлепшыя дарогі былі ў Гродзенскай эканоміі і каля Сямятыч, дзякуючы гаспадарлівасці Антона Тызенгаўза і Анны Яблаоўскай. Наш этнограф і гісторык пра навакольныя дарогі пісаў так: „Już na półtora tysiąca lat przed uchwałami sejmów polskich, na całem południu i zachodzie Europy budowała drogi i mosty zwykle murowane kultura państwa rzymskiego, mająca po temu obfitość kamienia, wapna, niewolników i pieniędzy, czego Polska ze swoją kulturą o kilkanaście wieków młodszą nigdy w tym stopniu nie posiadała". Значыць — і тады не было грошай, і тады droga была droga.

Я так бестурботна прыгадваю карпатлівых (бо корпаліся) даследчыкаў, таму мне не выпадае ўкараняцца ў крэсла, толькі ў выкліканую дарогу падацца. Падаўся я з Беластока ў напрамку нашай Пушчы, туды і назад; у пачатку лютага, у адліжную пару. Баранавіцкая дарога ў Валілы-Станцыю пабудаваная нядаўна і яшчэ прыстойна трымаецца, нават латы на ёй акуратныя. Далейшая дарога край Гарадка і Нязбодкі ў Кабылянку яшчэ навейшая; магчыма, што нават трымае раўню з дарогамі такога ж рангу на тэрыторыі былой рымскай дзяржавы. У Лесанцы крама нацэленая ў XXI стагоддзе, для аўтамабілістаў, адно здаецца толькі, што нашае грамадства яшчэ ў гэтым ракурсе не паспявае за ходам часу і ў той краме даволі малавата пакупнікоў.

Ад Новай Волі да Сушчы таксама яшчэ новая асфальтоўка, і на сушчанскай вуліцы свежы асфальт. Толькі вось там адна загваздка: сушчанская вуліца вельмі звілістая. Не ведаю я гісторыі гэтай вёскі, аднак маю падазрэнне, што землямера, які тую вуліцу трасіраваў, нешта кідала то ў адзін бок, то ў другі. Тое нешта ў Сушчы трымаецца і па сённяшні дзень — гэта, агульна кажучы, тамашняя вясковая крама, перад якой — на павароце — часта спыняюцца самаходы, а нерухомы самаход на павароце больш небяспечны ад рухомага. Але сушчанскай краме належыцца іншая асаблівая ўвага.

На нашых старонках шмат пісалася, пішацца і будзе пісацца пра выдатнага грамадскага нашага дзеяча Канстанціна Майсеню. Што ён пабудаваў не толькі гайнаўскі музей, але і вясковыя крамы; спыню я сваю ўвагу на апошніх, бо іх пабудова выклікала грамадскія з'явы, дагэтуль, як мне здаецца, не даследаваныя. У дамайсенеўскі перыяд нашага мінулага вясковыя крамы працавалі ў прыватных мужыцкіх хатах, а прадаўцамі ў іх былі ў прынцыпе гаспадары тых хат і пакупкі ў іх можна было рабіць амаль кругласутачна. Змянілася гэта з запускам Майсеневых новаўвядзенняў, якія раздзялілі прадаўцоў ад крамаў — пакупкі ў любы час ускладніліся. Толькі не ўсе вёскі ахапіла Майсенева мадэрнізацыя, не ўсюды паўсталі новыя крамы. У Ахрымах ці ў Сушчы, якая ўжо Майсені не падлягала, крамы працягвалі працаваць паводле старога прынцыпу — у любую прыстойную пару можна было ў іх нешта неабходнае купіць. А быў гэта акурат час, тая Майсенева эпоха, калі маё пакаленне ўваходзіла ў прагнасць насалоды сферментаванымі яблыкамі з дрэва пазнання дабра і зла. І тая прагнасць успыхала акурат тады, калі на новых мураваных крамах вісялі замкі — вечарамі або ў святы. За пахмеллем трэба было падавацца ў дарогу ў Ахрымы або Сушчу. Падаецца мне, што Сушча са сваёй традыцыйнай прыватнай крамай і па сённяшні дзень астаецца мэтай такіх паломніцтваў. І што тыя недалёкія пошукі ў выкананні майго пакалення асмелілі пакаленні чарговыя, якія за дэфіцытнымі таварамі сталі падавацца ў далёкія гандлёвыя эльдарада кшталту Лодзі ці Турцыі, а за адухаўленнем у Рым ці Іерусалім. А ўсяму гэтаму размаху, выпадкова, як мне здаецца, дала пачатак Майсенева непаседлівасць...

Адрэзак асфальтоўкі з Лешукоў у Старое Ляўкова асаблівы і трэба было б станоўча падумаць пра яго ўвядзенне ў пенітэнцыярную практыку. Менавіта, усіх кіроўцаў, якія перавысілі б дазволеную хуткасць, добра было б кіраваць паездзіць па гэтым адрэзку — дзеля вадзіцельскай рэадукацыі; мяркую, што такая форма ўздзеяння на надта бравых парушальнікаў дарожных правіл была б больш паспяховай чым штрафныя пункты і грашовыя пакаранні. Там ухабіна на ўхабіне, яма на яме. Мяркуецца мне, што тую дарогу будавалі надта ашчадна, aby Polska nie zginęła. Такую тандэту цяжка называць дарогай — droga winna być — усё ж такі — droga.

А можа я ў гэтым месцы памыляюся. Тых ухабін найбольш у невялікім радыусе ад расхадных дарог, што адыходзяць у Міхнаўку і Новае Ляўкова. Побач таго скрыжавання стаіць крыж, пра які калісь мне гаварылі, што ён дзеля аховы ад нячыстых сіл, якія любяць цікаваць каля расхадных дарог. Хто ведае, ці тых ямін не павыбівалі імунныя да нерухомага крыжа нячысцікі сваімі капытамі; мо каб крыху свянцонай вады на іх... Не давялося мне чуць, што ў нашым тутэйшым старонні заведзена спырскванне асфальтаў свянцонаю вадою для засцярогі ад іхніх танцаў...

Пушчанскі адрэзак шашы між Нараўкай і Гайнаўкай штораз больш раструшчваецца, а гэта доказ таму, што там усё яшчэ нешта дзеецца, што адбываецца рух, што гаспадарка там яшчэ дыхае, што ездзяць тудою грузавікі, якія сваімі грузамі раздушваюць немалады ўжо і знясілены гадамі цяжкай працы асфальт. Найбольш ён нямоглы на Скупаўскай паляне і каля перагрузачнага пункта, які калісь называлі Хрызанавам. І ў Дубінах, але пра гэта пазней.

Не ведаю, ці Навасады маюць нейкую легенду пра сваё далёкае мінулае, але калі яна забытая, тады трэба яе прыпомніць, а калі яе зусім не было, дык трэба такую гісторыю паклікаць да агульнага ведама. Ну, бо ж сама тапаграфія вёскі аж напрошваецца, каб Навасады сваю легенду мелі. Здаецца мне, што калісь-калісь, калі „садзілі" гэтую вёску, рабілі гэта два землямеры: адзін з іх трасіраваў вуліцу ад Скупава, а другі ад Дубін. І яны крыху размінуліся, быццам мелі нейкі левы ўхіл. І калі ўжо сходзіліся з сабою, рашылі не выпраўляць усёй вуліцы, толькі злучыць невялікім касячком свае творы, невялічкай стужкай вуліцы, так як цяпер стужкамі звязваюць нейкія ўрачыстыя сувеніры. І гэтую стужачку наш народ мабыць лічыць своеасаблівай святасцю. Бо на ёй якісь час таму вырасла папярочная перакладзіна, якой ніхто не хоча чапаць, быццам яна была нейкім сакралізаваным табу. З пункту гледжання аўтамабільнай механікі яна можа пагражаць самаходным шасі, і тую перакладзіну можна лічыць небяспечнай.

Пра Гайнаўку не напішу цяпер ні слова, бо ж на нашых старонках пра яе столькі, што нейкі вонкавы чытач можа падумаць што яна важнейшая за Беласток ці Брусель. У Гайнаўцы я толькі павярну сваё падарожжа назад, у напрамку Беластока, найперш у Дубіны. У пачатку лютага сонца ў нас заходзіць каля 16 гадзін 20 мінут, а вулічнае асвятленне ў Дубінах і Навасадах уключаецца ў 17 гадзін; значыць — на працягу сарака хвілін ахунаемся ў гэтых мясцовасцях у даэлектрычнае мінулае, вяртаемся да традыцыі. Толькі не цалкам, бо транспарт не вяртаецца, не вяртаецца маставая. А яна ў Дубінах — лепш не буду пісаць, каб каго не абразіць. Калі ў адліжны перыяд падае праліўны дождж, тады ў аўтамабільных фарах відаць галоўным чынам той дождж, а мокры асфальт і выемкі ў ім зліваюцца ў вачах у адну чарнату. І калі ў дадатак сустрэчная аўтафура залье падняцымі пратэктарамі дарожнымі памыямі лабавую шыбу... Але колы ўсе тыя ўхабіны вымацваюць і з громкім ломатам устрасаюць самаходам, просяць рамонту той дубінскай вуліцы, так як нашы падляшскія парламентарыі просяць у Варшаве аўтамагістралей у Беласток. А можа я непатрэбна пішу пра дубінскую вуліцу, можа пра яе *начальство лучше знает*...

Паміж Анцутамі і Трасцянкай стаіць дарожны знак абмежавання скорасці, а за ім папярочная ўпадзінка, якая з ходам часу, а дакладней кажучы — з яздою тудою самаходаў, буйнее. У мяне сумненне, раздвоенасць: ці варта было стаўляць там асцерагальныя знакі, ці мо лепш было б адразу выправіць ухабіну. Магчыма, што для выпраўлення ўхабіны патрэбная была апрацоўка дакументацыі, нейкія аўкцыёны на дакументацыю і на нівеляцыю маставой ці што яшчэ. А паставіць асцерагальны знак — пусцяковіна. І чакаць, аж нешта на дарозе здарыцца, і тады дзейнічаць. Так як гэта было пару гадоў таму, як там жа каля Трасцянкі здарыўся трагічны выпадак і зараз пасля яго на асфальце з Заблудава ў Гайнаўку з'явілася цэнтравая лінія. А на іншых такога ж рангу дарогах такія ж лініі здавён-даўна...

Не ведаю, што думае начальства пра нашы тутэйшыя дарогі. Магчыма, што яно занядбоўваючы іх робіць гэта мэтанакіравана, каб астаткі мясцовага насельніцтва занадта па тых дарогах не рваліся ў далёкі свет. Каб гэтае амаль эндэмічнае ўжо мясцовае насельніцтва крыху захавалася і трымала тут нейкую традыцыю, каб можна было хваліцца шматкультурнасцю і шмат якімі яшчэ „насцямі". Бо цяпер такая мода. А варшаўскае начальства нямодным быць не можа — гэта ж які сорам быў бы нам. Нам, бо ж мы тое начальства самі шчыра выбіраем.

Па вачах бачу...

Як піша рымскі гісторык Светоній, кесарскім эдыктам Клаўдзія былі зацверджаны „flatum crepitumque ventris in convivo mettendis" [псаванне паветра (якое можа быць) выкананае людзьмі пры спажыванні ежы]. Не здзіўляе мяне гэта ў выпадку гэтага абжоры і п'яніцы, які сваю ўладу выконваў па тагачаснай модзе не ўстаючы ад бяседнага стала. Мусіў ён канстытуяваць свае імператарскія ўздуцці, бо інакш не мог бы кіраваць! Сёння слухаючы, што вярзуць некаторыя дэпутаты з сеймавай трыбуны, можна б падумаць, што эдыкт аб пёрдах абавязвае надалей. Няхай чытач даруе мне моцнае слоўца. Ну, дык калі дэпутаты Рэчы Паспалітай бяскарна зневажваюць адзін аднаго дзякуючы імунітэту, якім я, як грамадзянін тае ж Рэчы Паспалітай, надзяліў іх шляхам галасавання на іх асобы, дык зневажаюць яны і мяне, і ў мяне ёсць права на моцную крытыку.

Паклёпы, што ліюцца як з памыйніка з сеймавай трыбуны (а перадавікамі ў іх члены — увага! — Права і справядлівасці, хоць неабавязкова толькі яны), зневажаюць годнасць усіх грамадзян Рэчы Паспалітай, незалежна ад іх нацыянальнасці, веравызнання і палітычных схільнасцей. Вось паны дэпутаты адзін праз аднаго навыперадкі абражаюць нашу грамадзянскую ўражлівасць. Беспакарана. Вось якісь маладзён у дэпутацкім сур'ёзе падрывае гонар кіруючага прэм'ер-міністра. Беспакарана. Вось адзін вядомы лідар, у інтэрв'ю дадзеным парталу Onet.pl намякае, што цяперашні прэзідэнт з-за сваёй дробязнасці непасрэдна спрычыніўся да смерці трох дэпутатаў, загінуўшых у катастрофе пад Смаленскам. Беспакарана. А ці паклёпы без даказвання іх сапраўднасці не з'яўляюцца хлуснёй?

Калісьці Гебельс гаварыўшы, што хлусня паўтораная сто разоў становіцца праўдай, не ведаў, мабыць, што стварае падставы палітычнаму піяру. Гаворка, аднак, не пра самую хлусню, якую чуем з сеймавай трыбуны, але пра тое, што за ёю стаіць. А стаіць за ёю свядомае сваіх мэт карысталюбнае палітычнае надумства. Калі кагосьці абкінуць гаўном, дык прабачце, смурод ад яго нялёгка саскрэбці, нават з прачыста святога чалавека. Бо калі нават як найбольш старанна ён ачысціцца, то і так, не абражаючы нікога, застанецца доўга ў чалавечай памяці... гаўняным святым.

У час Вялікай чысткі ў 1937 г. бяскарна раскідвалася паклёпамі нейкая Поля Нікалаенка, персона змрочная і злавесная, якую Сталін расхвальваў як „гераічную даносчыцу з Кіева". Спецыяльнасцю гэтай жахлівай дамы, адказнай за смерць прынамсі васьмі тысяч чалавек, было ўставанне ў часе сходаў і выкрыкванне абвінавачванняў. Хрушчоў засведчыў у сваіх дзённіках як «паказала пальцам і сказала: „Не ведаю гэтага чалавека, ды пазнаю па вачах, што гэта — вораг"». Ужо гэтага хапіла, каб няшчаснага паставіць пад сцяною і на здзек чалавечаму праву і справядлівасці проста забіць яго стрэлам у патыліцу. І што на гэта скажа пані дэпутатка Кэмпа?

Амаральных палітычна выказванняў, кіданых з сеймавай трыбуны, магу прывесці дзесяткі. Справа аднак не ў словах, а ў тых, хто бяскарна знеслаўляе іншых, але і ў тых, што будучы знеслаўленымі, падгінаюць хвост. Гэта праява найбольшай крывадушнасці — паддацца прысуду выбаршчыкаў з надзеяй, што асудзяць яны паклёпнікаў выбарчым байкотам. Тыя кіруюцца тым, што перададуць ім СМІ, а медыі цікавіць эканамічны ці палітычны прыбытак. Або адно і другое. Справа не ў судзе над хлуснёй і паклёпамі, а ў медыйным шуме, які, на жаль, з'яўляецца заўсёды астракізмам (чарапковым асуджэннем), абапертым не на справядлівую ацэнку, а на людскія эмоцыі. Знакаміта разумее гэты механізм Аляксандр Лукашэнка, вядомы моцнай рукой (а можа хутчэй кулаком) у адносінах да СМІ. Не шкадуе ім ні бізуна, ні перніка. І вось кіруе як імператар Клаўдзій і як той не адыходзіць ад карыта. Пардон — ад стала. Дык і пачынаюць яго турбаваць розныя такія палітычныя ўздуцці. Яшчэ крышачку — і ўзарвецца. Ну і добра. Беларусы ўрэшце ўчуюць, што сапраўды павінны ўчуць. І на канец моцная разыначка наконт „гераічнай даносчыцы з Кіева" — вось паводле сведчання Хрушчова, каб уратаваць жыццё і аправергнуць яе абвінавачанне, трэба было хуценька адказаць: „Не ведаю гэтай кабеты, што якраз на мяне паказала, ды пазнаю па вачах, што гэта курва". Ці мы так маем бараніцца?

Міраслаў ГРЫКА

АБ'ЯВЫ

ЗАПРАШЭННЕ

Дыскусійны клуб „**АБ-БЫ**"
Пагаворым пра палякаў у Беларусі

Сустрэча з
Анджэем Пачобутам
журналістам, публіцыстам, дзеячам польскай меншасці ў Беларусі
18.03.2011 (пятніца) 18.00
Пачатковая школа № 4 у Беластоку
вул. Чэнстахоўская, 6а
Projekt realizowany dzięki dotacji Marszałka Województwa Podlaskiego

«Пра гісторыю ў Крынках»

Згуртаванне „Terra incognita" запрашае 23 сакавіка ў Крынкі ў публічную бібліятэку на сустрэчу ў рамках цыкла

„У добрай кампаніі". У праграме даклад
д-р Лены Казлоўскай-Глагоўскай,
прысвечаны ўзнікненню Беларускай Народнай Рэспублікі і памяці Лукаша Дзекуць-Малея.
Пачатак у 17.00.

Снежаньскія падзеі ў Беларусі рэхам разнесліся па свеце. Дзесьці гэтае рэха было чуваць лепей, дзесьці ледзь-ледзь. Дзякуй Богу, яго пачулі многія на планеце. І не толькі пачулі, але і спрабуюць зрабіць нешта, каб з Беларусі прыходзілі не адны расповеды аб збіццях, допытах, затрыманнях, але і навіны аб свабодных выбарах, фармаванні дэмакратычнага парламента, дзе прысутнічаюць прадстаўнікі розных палітычных плыняў. Да адной з такіх спроб варта аднесці кампанію Free Belarus Now (Вольная Беларусь зараз), якая была створана, як сведчыцца на галоўнай старонцы, „каб прыцягнуць увагу свету да становішча ў Рэспубліцы Беларусь".

Сайт кампаніі, які месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://freebelarusnow.org**, мае прывабнае выяўленне. На ім пераважае бела-чырвоная каляровая гама. Праўда, цікавай адметнасцю яго з'яўляецца і перавага там англійскай мовы, нягледзячы на існаванне трох моўных версій — беларускай, рускай і англійскай. І назва сайта, і назвы рубрык падаюцца выключна па-англійску, больш таго — некаторыя зместы старонак не маюць беларускага альбо рускага варыянта. Магчыма, аўтары сайта зрабілі гэта дзеля разумення мэт сайта для большага кола англамоўных людзей.

„Гэты сайт быў створаны групаю сяброў, членаў сямей і паплечнікаў ахвяр рэпрэсій Лукашэнкі. Мы запрашаем вас пазнаёміцца са зместам гэтай старонкі, каб даведацца болей пра сітуацыю ў Беларусі, пра злачынствы і беззаконне, якое адбываецца там. Існуе шмат спосабаў падтрымаць тых, хто пацярпеў і працягвае цярпець ад рэжыму Лукашэнкі. Мы спадзяемся, што вы зможаце гэта зрабіць", — звяртаюцца да наведвальнікаў стваральнікі партала. І іх адозва знайшла водгук у сэрцах шмат каго са знакамітых людзей планеты.

Калі мы зазірнем на старонку About Us („Пра нас"), то сярод удзельнікаў кампаніі ўбачым першага і апошняга прэзідэнта СССР, „архітэктара перабудовы" Міхаіла Гарбачова, пісьменніка Тома Стопарда, колішняга прэзідэнта Чэхаславакіі Вацлава Гавела, акцёра Майкла Дугласа і шмат іншых грамадскіх і культурных дзеячаў з розных краін.

З тым, да чаго імкнецца кампанія, мы можам пазнаёміцца на старонцы Goals („Мэты"). Сярод гэтых мэт — патрабаванне ад урада Беларусі шанавання міжнародных стандартаў правоў чалавека, у прыватнасці, свабоды слова і свабоды сходаў, інфармаванне грамадскасці па-за межамі Беларусі аб дзейных абставінах у краіне праз працу з СМІ і публічныя дзеянні.

Для таго, каб дапамагчы кампаніі ў збіранні фактаў, на старонцы Evidence („Сведчанні") падаецца адрас, на які варта накіроўваць звесткі пра парушэнні правоў чалавека з боку рэжыму Лукашэнкі, альбо сведчанні, якія могуць дапамагчы арыштаваным пасля падзей 19 снежня 2010 г.

Зразумела, даны сайт не можа абысціся без узгадвання тых, хто зараз церпіць ад правячага беларускага рэжыму. Іхнія партрэты з інфармацыяй месцяцца на старонцы Victims („Ахвяры").

Аб тым, у чым мае патрэбу кампанія гаворыцца ў рубрыцы HowYou Can Help („Як вы можаце дапамагчы"). Сярод варыянтаў дапамогі — далучэнне да кампаніі ў сацыяльных сетках Facebook і Twitter, перадача артыкулаў, напісанне адпаведных лістоў ва ўрады сваіх краін, Еўрапарламента, альбо грашовыя ахвяраванні.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

С БЕЛАРУСІ к а р б ы

Крэўскі замак

Часам шчасціць дакрануцца рукамі да даўняй гісторыі непасрэдна. Мне такая мажлівасць выпала ў канцы васьмідзесятых гадоў мінулага стагоддзя, калі наш студэнцкі атрад выправіўся на археалагічныя працы ў старадаўняе і славутае мястэчка Крэва, што на Смаргоншчыне. У першы сезон нам выпаў гонар капаць і метр за метрам разбіраць завалы галоўнай, так званай Княскай вежы. Работа гэта была не з лёгкіх. Нехта сярдзіта, але моўчкі, дзёўб ломам старадаўні друз, нехта адкрыта абураўся такога роду працай і ў перапынках ціха стагнаў у цяні грушкі, што вырасла проста на вале колішняй сцяны. А некаторыя, што не служылі ў савецкім войску і не спазналі сапраўдных „тягот и лишений", па надуманых прычынах спрабавалі нават пакінуць нашу „катаржную" каменяломню. Але з кожным днём і пластам заглыблення ў „нетры стагоддзяў" бальшыню з нас агортвала нейкае асаблівае пачуццё далучэння да слаўнай і трагічнай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менавіта ў сутарэннях гэтай вежы сядзеў стары князь Кейстут, урэшце забіты сваім пляменнікам Ягайлам. Менавіта адсюль тады ж удалося ўратавацца вялікаму Вітаўту, які, паводле легенды, пераапрануўся ў адзенне служанкі і, падмануўшы варту, здолеў выйсці непазнаным па замкавай сцяне, уцячы з жахлівага каменнага мяшка. Чым больш мы заглыбляліся, тым больш агортвала трымценне: а што калі менавіта да гэтай цэглы прытуляліся шчакой тагачасныя вязні, калі менавіта гэтыя камяні мацалі іх ваярскія рукі!? Калі менавіта ў гэты пясок была праліта кроў князя Кейстута!? А яшчэ нас ахінаў крылом традыцыйны сімвал Беларусі — бусел, які злажыў сабе гняздо на самай вяршыні стромых рэштак Княскай вежы (пазней мясцовыя людзі перанеслі буслянку ў іншае месца, паставіўшы ў Крэве адмысловы слуп). Пад пільным вокам гэтага бусла ў перапынках паміж раскопкамі прыемна было спаласнуць і ахаладзіць галаву, нагнуўшыся з кладачкі ў плыткую рачулку Крыўлянку...

Сутнасць сярэднявечнага ліцвінскага праклёну „каб цябе ў Крэва забралі каменне цягаць" стала мне зразумелай праз год, калі мы прыехалі на другі сезон археалагічных даследаванняў. На гэты раз, акрамя традыцыйных раскопаў на дзядзінцы, мы білі глыбокія шурфы, у тым ліку і непасрэдна пад сценамі замка. Уразілі магутныя і заглыбленыя падмуркі цвердзі. Яны настолькі трывалыя, што гэтае сярэднявечнае збудаванне, у адрозненне ад таго ж Гальшанскага замка, абсалютна падлягае адбудове на старой аснове. Можа і добра, што за рэстаўрацыю не ўзялася цяперашняя, не беларуская па сваёй прыродзе і сутнасці, улада. Крэўскі замак мае і свайго „роднага брата" — адначасна з ім па абарончай лініі забудоўваўся і замак у Медніках, шмат у чым падобны і адноўлены яшчэ ў савецкі час сучаснымі літоўцамі.

Сцены Крэўскага замка перажылі і пабачылі нямала: сямейную здраду, падпісанне дзяржаўнай уніі, якую адны расцэньваюць як непазбежны палітычны кампраміс, а іншыя — як пачатак заняпаду Вялікага Княства, шматлікія нашэсці знішчальнікаў: ад рабавальнага набегу Свідрыгайлы — да крымскіх татараў, ад маскоўцаў — да гарматнага абстрэлу кайзераўцаў у першую сусветную вайну. Сюды ўцякаў ад дэспата Івана Жахлівага князь Андрэй Курбскі, сюды прыязджалі кароль Жыгімонт Стары і прэзідэнт даваеннай Польшчы Ігнацы Масціцкі, сюды прыйшлі саветы, якія ніяк не могуць зысці. Крэўскі замак захоўвае ў сваёй памяці нямала таямніц, легенд, слёз і радасцей. І чакае, чакае, калі нарэшце прыйдзе яго Адраджэнне.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Запрашэнне

25.03.1918 **БНР** 25.03.2011

Святкаванні 93-х угодкаў

Беларускай Народнай Рэспублікі

адбудуцца 25 сакавіка (пятніца) у Беластоку ў цэнтры Ваяводскага асяродка анімацыі культуры „Сподкі" па вул. Святога Роха, 14 у Беластоку а гадз. 18.00 (уваход свабодны)

Запрашаюць:
Радыё Рацыя,„Ніва", Беларускі саюз

Запрашэнне

З нагоды акту 25-га Сакавіка ў Фарным касцёле „белы" у суботу 26 сакавіка, у 17 гадзін адбудзецца імша на беларускай мове

запрашаюць вернікі

5 ☞ працяг

ным элементам звычаю быў лён. На кані аб'язджалі ўсе вёскі, каб лён быў урадлівы. Лён для беларусаў гэта было золата, якое апранала і карміла. Важнае месца ў традыцыі масленіцы займалі малочныя прадукты, асабліва наліснікі са смятанай ці мёдам.

На сцэне па маладых акцёрах не было відаць хвалявання. Іграючы аднаго з гасцей дома, у якім адбылася тэатралізаваная масленіца, Іерамія з Тыневіч-Вялікіх прызнаўся:

— Мы сустракаліся, рыхтуючы гэтую сцэнку, час ад часу на ўроках, часцей, аднак, пасля іх.

Калі мы спыталіся ў яго, чаму рашыўся выступіць у гэтай сцэнцы, адказаў: „Я проста люблю выступаць!".

Несумненна, адным з атракцыёнаў мерапрыемства было выступленне жаночага калектыву „Крыўчанкі", які аднавіў сваю дзейнасць пасля трох гадоў перапынку і стаў лаўрэатам II месца ў катэгорыі вакальных ансамбляў аўтэнтычнай народнай песні на XVIII Агульнапольскім фестывалі беларускай песні. Як прызналіся яшчэ да выступу сяброўкі гэтага калектыву Вольга Масайла з Прыбудак і Анна Тэслюк з Гарадзіска, „Крыўчанкі" спяваюць часта ўжо прызабытыя песні з навакольных вёсак.

Фота Мацей ХАЛАДОЎСКІ

— У маладыя гады збіраліся мы па вёсках з дзяўчатамі і спявалі амаль штодзень. А цяпер гэта ўжо прападае, як знікае беларуская мова. Калісь на масленіцу збіраліся па хатах і жанчыны, і мужчыны. Спявалі, елі і пілі, а пасля належна пасціліся. На жаль, цяпер неяк тая традыцыя прападае, хоць у Ласінцы ёсць маладыя дзяўчаты, якія спяваюць. Ёсць там нават тры ці чатыры царкоўныя хары! Аднак па вёсках меншае людзей. Застаецца нам — толькі спяваць!

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

20.03 — 26.03

(22.03. — 20.04.) 21.03. абтрасешся з рэштак меланхоліі, шмат радасных хвілін, адчуеш сябе адважным, моцным і рашучым. Паправяцца і здароўе, і настрой. Маеш шанц пачаць усё нанова. Удасца! Ды 23.03. можаш сябе адчуваць горшым ад іншых (не думай кепска пра сябе!). Не рабі радыкальных змен у сваім выглядзе.

(21.04. — 21.05.) Пры інтэлектуальных пошуках зацікавяць цябе справы, якімі раней ты не цікавіўся. Пад уплывам новых знаёмых маеш шанц пашырыць гарызонты і змяніць сваё жыццё. Калі добра пашукаеш, знойдзеш лепшую працу, большыя грошы і... каханне. Да 27.03. маеш гарантаваную сімпатыю ўсіх з кім будзеш мець дачыненне. Не адмаўляй нікому дапамогі.

(22.05. — 22.06.) Лепшыя ўмовы стварай сабе сам. Запасы на рахунку ўрэшце падрастуць, знаёмыя будуць спрыяць, а каханне нясмела застукае ў тваё сэрца. Мілая атмасфера ў фірме. Можаш выйграць або атрымаць працэнты ад добрых інвестыцый. Папрацуй над сваім вострым языком. Добра карміся і варушыся.

(23.06. — 23.07.) Зрабі крок у напрамку мараў, а рэшта пойдзе сама сабой. Лепш быць аднаму, чым мець побач сябе людзей, якія ахвотна ўтапілі б цябе ў лыжцы вады. Інвестуй адважна (бо перад табою немалыя прыбыткі), але ўсё кансультуй з блізкімі. Можаш аднавіць свой гардэроб.

(24.07. — 23.08.) 23-27.03. — зоркі прынясуць табе вялікую папулярнасць. Твае акцыі пойдуць увысь, здабудзеш сімпатыкаў і прыхільнікаў. Наймілейшыя дні і ночы да 27.03. Прымусь сябе да фізічнага высілку, а набярэш большай ахвоты да жыцця.

(24.08. — 23.09.) Добрыя арыгінальныя задумы. Клопат пра грошы гарантуе бяссонніцу, ды калі трэба будзе, хтосьці табе паможа або прадасі якуюсь драбязу. Калі заробіш, не бойся выдаваць. Не бойся экстравагантных пакупак і смелых змен у сваім выглядзе. Твая бліжэйшая ці далейшая сям'я можа павялічыцца.

(24.09. — 23.10.) Спрыт, інтэлігентнасць, кемлівасць дазволяць табе перамагчы канкурэнцыю. Прыгоды і цікавыя сустрэчы гарантуюць табе добры настрой. Не наракай на сямейнікаў. Шчыра паразмаўляеш з партнёрам. Маеш рацыю — не дазволь на панібрацтва асобе, якой не давяраеш. Не пазычай нікому грошай.

(24.10. — 22.11.) Пры складанасцях звярніся па параду да знаёмых і сям'і. Слухай іх парад, калі нават здаецца табе, што ты ведаеш лепш. Цяжка будзе запанаваць табе над гневам і злосцю. Дзейнічай асцярожна. Пачуцці поўныя пасіі і жарсці (асобы народжаныя пасля 17.11. — не ўкляпайцеся ў пачуццё без будучыні!). Знакаміта ў фінансавым плане прадбачваецца апошняя дэкада месяца.

(23.11. — 22.12.) Бярыся за найцяжэйшыя справы! Шчасце — на кожным кроку. Меркурый спрыяе інтарэсам і рэалізацыі небанальных ідэй. Новае акажацца значна лепшым, чым старое. Добры час на сямейныя імпрэзы. Паправіш кандыцыю натуральнай актыўнасцю, а не катаваннем на трэнажорах ці цуд-дыетамі.

(23.12. — 20.01.) Да канца месяца чакаюць цябе нялёгкія выбары. Не прымай усяго за чыстую манету — не ўсё золата, што свеціцца! Можаш пазнаёміцца з вельмі цікавай асобай са знакаў Стральца або Рыб. Фінансавая завіруха непрацяглая, купіш тое, што трэба, ды адкладзі грошы на магчымую паездку.

(21.01. — 19.02.) 20-23.03. Сонца дасць табе сілу і адвагу. Перамервай новыя шляхі і здзяйсняй свае мары. Працавітыя дні, ды твой высілак не пойдзе ўпустую; усе самыя смелыя задумы зрэалізуеш. Ідзеш да лепшага! У кампанейскіх адносінах спакойна не будзе — падымі кінутую рукавіцу; хуткасць і паспяховасць прынясуць табе перамогу.

(20.02. — 21.03.) У апошняй дэкадзе — лепшыя заробкі, хоць і большыя выдаткі. Купіш тое, на што здаўна ўглядаўся. Добры час для вучобы, экзаменаў. Рыбы народжаныя пасля 18.03., каб не застацца ў хвасце, мусяць уключыць пятую скорасць. З 26.03. наваліцца на вас мноства абавязкаў.

Агата АРЛЯНСКАЯ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — страфу Уладзіміра Няклаева.

1. настаяцель мужчынскага кляштара = 52 _ 48 _ 103 _ 45 _;
2. прадмет вупражы, які надзяваецца каню на галаву = 44 _ 42 _ 43 _ 2 _ 50 _ 51 _;
3. кантынент з Манголіяй = 65 _ 105 _ 39 _ 67 _;
4. завяршальнае слова малітвы = 25 _ 26 _ 27 _ 28 _;
5. муж маці = 12 _ 13 _ 14 _ 15 _ 16 _ 17 _;
6. мятла = 68 _ 41 _ 53 _ 54 _ 55 _;
7. бацька маці = 87 _ 88 _ 89 _ 86 _;
8. сын дзеда = 30 _ 31 _ 32 _ 33 _ 34 _ 35 _ 36 _ 37 _;
9. уліваецца ў Азоўскае мора = 1 _ 56 _ 95 _;
10. без агню не бывае = 98 _ 75 _ 97 _;
11. агародная расліна сямейства гарбузовых = 112 _ 49 _ 113 _ 114 _;
12. засмучэнне, шкадаванне = 74 _ 85 _ 90 _ 120 _;
13. гаспадар Алімпа = 99 _ 100 _ 101 _ 115 _;
14. мусульманскі духоўны = 118 _ 38 _ 111 _ 73 _;
15. усходні сусед Нігерыі = 79 _ 81 _ 82 _ 83 _ 80 _ 84 _ 40 _;
16. снарад мінамёта = 47 _ 19 _ 94 _ 46 _;
17. Іван, савецкі агратэхнолаг (1855-1935) = 57 _ 60 _ 61 _ 58 _ 104 _ 96 _ 59 _;
18. жыхар Берліна = 20 _ 21 _ 18 _ 29 _ 119 _;
19. сталіца Асірыі = 70 _ 69 _ 71 _ 91 _ 92 _ 93 _ 109 _;
20. вадкі метал серабрыста-белага колеру = 63 _ 64 _ 78 _ 76 _ 77 _;
21. акула альбо баракуда = 4 _ 7 _ 6 _ 5 _;
22. хімічны элемент н-р 16 = 108 _ 106 _ 110 _ 62 _;
23. брат дачкі = 22 _ 23 _ 24 _.
24. рытуальная забарона = 116 _ 117 _ 3 _ 107 _;
25. спадарожнік у сонечнае надвор'е = 8 _ 11 _ 10 _ 9 _;
26. службовы вайсковы разрад = 102 _ 72 _ 66 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 7 нумара

Балі, жэмчуг, празаік, ар, Кім, Пенза, сівізна, Дэкалог, згода, важаты, казёл, ампір, пі, Літва, Чыкага, мапа, чын, атол, цар, аўсюк, Вільня, Ішым, самалюб, жняя, сужыццё, алень, лямец, Рыга, лыч, байрам.

Рашэнне: **Ты пакліч мяне, пазаві, сто дарог за маімі плячыма; пачынаецца ўсё з любві, а інакш і жыць немагчыма.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Аляксандру Дабчынскаму** і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.
Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.

Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк, Янка Целушэцкі.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.
Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty.
Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju.
Cena prenumeraty kwartalnej
— 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734
Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2011 roku — 52.
Przesyłka zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 5,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.
Przesyłka priorytetowa: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 7,20 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje: Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 300 egz.

Пра тое, калі ажываюць чорныя карты суседскай гісторыі і як далёка ад паэзіі да рэчаіснасці ***Ілоне Карпюк*** *распавядае бялышчанін* ***Андрэй Сальнікаў***

ПАМІЖ ПАНТЭІЗМАМ І ХРЫСЦІЯНСТВАМ

Андрэй Сальнікаў — бялышчанін, народжаны ў 1960 годзе ў Беластоку, выпускнік Белліцэя ў Бельску-Падляшскім ды філасофскага факультэта Універсітэта імя Марыі Складоўскай-Кюры ў Любліне. Дзевяць гадоў працаваў выкладчыкам Вышэйшай педагагічнагай школы ў Жэшаве, заснавальнік і першы галоўны рэдактар літаратурна-мастацкага часопіса „Фраза". Цяпер жыве ў Бельску-Падляшскім. У 2010 годзе паказаўся зборнік яго паэзіі *Ptakodrzew czyli dojrzewanie.*

— Аднагодкі глядзелі на Вас падазрона...

— „Качка-дзівачка", „грэцкі філосаф" — так мяне называлі ў падставовай школе. Глядзелі на мяне крыху як на дзівака. Можа я быў крыху больш рэфлексіўны.

— Адкуль задума вывучаць філасофію?

— Яшчэ ў Беларускім ліцэі ўдзельнічаў я ў турніры па філасофіі. Прыйшоў поспех. Сустрэў я іншага бялышчаніна, які вучыўся на філасофскім факультэце і вырашыў паступаць. Філасофія зацікавіла мяне праз літаратуру, асабліва паўплывала вывучэнне перыяду „Маладой Польшчы". А таксама націск у нашым ліцэі на ўдзел у алімпіядах і значэнне алімпійскіх поспехаў у час экзаменаў.

— Чаму Бельскі белліцэй?

— Перш за ўсё з-за высокага ўзроўню навучання. Тады я не асацыяваў гэтага ліцэя з пытаннямі тоеснасці ці нацыянальнасці. Я і двух маіх калег паступілі ў ліцэй без ранейшага вывучання беларускай мовы з перакананнем, што гэта лепшая школа.

— Як ішла навука беларускай мовы?

— Даволі складана без падрыхтоўкі ў падставовай школе. Мучыўся я з граматыкай, але недахопы выраўноўвала зацікаўленне літаратурай, таму і настаўнікі часам глядзелі прыхільна. Шырэй рэалізаваўся я на польскай мове. Вёў школьную газету, якая паўставала пад шыльдай скаўтаў. У ёй, між іншым, друкаваў я свае вершы.

— А вершы на беларускай мове?

— Той, хто пісаў па-беларуску, хутчэй за ўсё друкаваўся ў „Ніве".

— Ці нешта вылучала тады вучняў Белліцэя?

— Ліцэй ствараў сваё асяроддзе, якое жыло сваім жыццём, так як сваім жыццём жыў Бельскі ліцэй імя Тадэвуша Касцюшкі. Быць побач сябе, а не разам напэўна не спрыяе будаванню лакальнай супольнасці. Калі няма дыялогу ў час вучобы, гэта перакладаецца на дарослае жыццё. Некаторыя называюць гэта талерантнасцю, але мне здаецца, што гэта памылковая назва. Занядбанне ў гэтай галіне ды ізаляванне толькі ў сваім культурным крузе вядзе ў далейшай перспектыве да нацыяналізмаў.

— З кім адчуваеце супольнасць, якую ўспамінаеце ў вершы „Малая айчына"?

— Супольнасць у сэнсе даспявання чалавека гэта даспяванне да самай высокай грамадскай вартасці, якое сведчыць пра еднасць з бліжнімі, не толькі ў хрысціянскім сэнсе, але таксама ў разуменні лакальнай, рэгіянальнай супольнасці. Для мяне гэта якраз Бельск.

— А постаці з верша без пераапрання?

— Гамбровіч пісаў пра людзей, якія надзяваюць маскі, але мяне гэта не пераконвала, бо я не бачыў іх тут. Можа гэта вынік жыццёвага вопыту, бо прыходзіць час, калі чалавек умее ўжо расшыфраваць разнародныя позы, бачыць, што хаваецца за маскамі, бо яны празрыстыя. У размове можна тады дакрануцца да сапраўднага „я" чалавека.

— Частка Вашага „я" ў вёсцы Гацькі. Як успамінаеце там праведзены час?

— Сёння мне гэта падаецца раем. Час дзяцінства ў абставінах цудоўнай прыроды. Крыху зайздросціў я сваякам, якія там жылі, бо яны былі патрэбныя на гаспадарцы. Я, гарадскі хлапец, не быў там надта патрэбны, бо мае абавязкі гэта толькі хадзіць у школу, а там можна было яшчэ і дапамагчы. У такіх выпадках я ганарыўся сваёй працай, адчуваў сябе вартасным. А ўдзельнічаў я ў амаль усіх гаспадарскіх працах. Можна сказаць, што адчуў задзіночанне з прыродай. Сёння гарадскі чалавек часам нават каровы ўжывую не пабачыць.

— Як успамінаеце тамтэйшых людзей?

— Непасрэдныя, аж занадта, без увагі да таго, што гавораць да дзіцяці. Але заўсёды шчырыя, добразычлівыя, нават калі таўстаскурыя. Вядома, перагружаныя працай, але гэта вынік жыцця паводле рытму прыроды, што для іх усё ж такі было натуральнае. Самае цікавае, што не думалі пра сябе як пра нейкі дадатак да прыроды, але як пра яе сапраўдную частку.

— Свае яны ці чужыя?

— Свае. Мяне таксама ўспрымалі як свайго, хаця я з горада. Гаварылі да мяне па-свойму, а я адказваў па-польску, бо ў польскай мове быў выхаваны. Пасля крыху навучыўся гаворкі. Гэта дыялект, які фармаваўся пад рознымі ўплывамі. Нацыянальнасць гэта асобная справа. Культуры ніколі не будуць развівацца без кантакту і дыялогу з наваколлем, асабліва на Падляшшы. Прытым нельга забываць пра сучасную культуру. Добра было б, каб і беларусы, і украінцы больш перакладалі на польскую мову. Самі поўнымі прыгаршчамі чэрпаюць з польскай культуры, але варта даць шанс палякам пазнаваць культуру другога боку. Вельмі добра, што паказалася кніжка Міхала Андрасюка „Wagon drugiej klasy". Гэта крок наперад.

— А Ваша нацыянальная тоеснасць?

— Дзед з боку бацькі — расіянін, баба з вёскі Пружана ў Расіі, а яе бацька праўдападобна украінец з-над Дону. У час II сусветнай вайны вывезлі іх у Нямеччыну на работы, а гаспадарку спалілі. Пасяліліся яны тады ў Польшчы. Сям'я мамы, Дамброўскія, заўсёды жыла ў Гацьках, што пад Бельскам. Прадзед быў багатым селянінам, але пасля бежанства зямлю трэба было дзяліць і пачалося бяднейшае, вясковае жыццё. Мама за бацькам хутка пераехала ў Бельск, дзе я выхаваўся. У мяне шмат русінскай крыві, рускай, гэта важнае. З другога боку адчуваю польскасць, з якой увесь час бяру нешта для сябе. Мая малая айчына гэта Бельск і ваколіца.

— Ёсць там месца для беларускасці?

— Ёсць. Але гэта ў межах карэннай для нас усіх рускасці. Не хачу выбіраць, бо трэба было б ставіць адну культуру перад другой. Адчуваю сябе проста славянінам. Яшчэ працуючы ў Жэшаве сарганізаваў я навуковае кола Студыя славянскай культуры, якое выдавала грамадска-літаратурны часопіс „Фраза". Там, між іншым, мы эксперыментавалі з дыялогам і адкрытым навуковым падыходам да тэм культурнага абмену. Вядома, што там датычыла гэта украінскасці. А тут універсітэт спіць.

— Не цягне Вас зноўку да акадэмічнай працы?

— Творца можа плённа развівацца таксама па-за такой працай. Да гэтага ён не абцяжараны дыдактычнай працай. Усё залежыць ад крэатыўнасці і ідэй. Я развіваюся апошнім часам у галіне паэзіі. Паэту неабавязкова хадзіць у хмарах, без кантакту з рэчаіснасцю. Сам Мілаш (польскі пісьменнік, лаўрэат Нобелеўскай прэміі — рэд.) сказаў, што паэзія павінна імкнуцца да блізкага кантакту з рэчаіснасцю, з'яўляцца спосабам на яе даследаванне і мастацкае апісанне. Здзяйсняюся як даследчык у гэтай галіне. Калі ідзе пра філасофію, то ў мяне свае планы і закінутыя раней ідэі. Хачу, між іншым, падняць тэму прыватнасці чалавека як з'явы, якая выконвае важную ролю ў жыцці і развіцці чалавека. Часта гэты абшар абмінаецца ў даследаваннях. Узнікае пытанне, ці ўвогуле можна азначаць прыватнасць.

— Тады прыватна, вяртаецеся часам у Жэшаў?

— Раз ці два разы ў год стараюся. Наведваю сваю сям'ю, якой я вельмі рана абзавёўся. Яшчэ ў час студыяў. Жылі мы ў сямейным пакоі ў студэнцкім інтэрнаце. З-за розных абавязкаў і заняткаў не прысвяціў я ёй, відаць, дастаткова часу.

— З чаго зараз жывяце? З паэзіі хіба складана.

— З пенсіі. Гэта вынік псіхалагічнага надлому. Вяртанне на Падляшша дапамагло мне з яго вырвацца. З паэзіі, вядома, жыць цяжка. Гэта занятак толькі для адзінак. Але наракаць няма што, бо нараканне нічога не мяняе. Можа прыйсці неспадзяваны поспех, можа прыйсці момант натхнення, але такія моманты могуць ніколі не здарыцца.

— Якія ў Вас адчуванні наконт свайго паэтычнага зборніка „Ptakodrzew"?

— Гэта мастацкі змест, да якога часта вяртаюся. Асабліва, калі адчуваю сябе разгубленым. Яны паказваюць мяне сапраўдным, як вяртацца да сябе. Сустрэў я падыход, што раз напісанае ўжо не належыць аўтару. А я думаю наадварот, што гэта неадказнасць. Не ацэньваецца тады належным чынам працы над сабой, што можа быць падказкай для чытача, які адчувае з намі нейкую супольнасць. Я, напрыклад, адчуваю, што творчасць Алеся Разанава (беларускі паэт і перакладчык — рэд.) мне блізкая. На мой погляд свет у яго творчасці, усе яго вымярэнні і тое, што па-за ім стварае нейкую еднасць, якой чалавек з'яўляецца проста часткай.

Фота Ілоны КАРПЮК

— А Ваша філасофія?

— На адным полюсе знаходзіцца блізкі мне пантэізм, атаясамліванне прыроды з Богам. З другога боку — хрысціянства, Бог як асоба. Арыентацыя паміж гэтымі светапоглядамі самая карысная еўрапейскаму чалавеку. У такі спосаб некаторыя інтэрпрэтуюць таксама Мілаша.

— Жывяце ў згодзе са сваёй філасофіяй?

— Філосафы наогул не жывуць паводле сваіх філасофій (маю на ўвазе перш за ўсё сістэмныя філасофіі). Іншая справа, калі ідзе пра экзістэнцыялізм ці гэтак званую філасофію дыялогу, сустрэчы, якая мне самая блізкая. Яна больш прылягае да рэчаіснасці. Мой светапогляд можна адшукаць у маім зборніку. Яго канон ствараюць вершы „Ікона", „Прысутнасць", „Абсалют" і „Чалавек". Ікона, напрыклад, гэта сутнасць праваслаўя, сутнасць праўды і дабрыні, якія адчуваем інтуітыўна. Позірк з іконы нясе чалавека да небасхілу, ахоплівае любоўю, павышае яго вартасць.

— Бог у Вас тады не творчая фігура, а сапраўдны абсалют?

— Так, я атаясамліваюся з праваслаўем.

— Звычайна не пытаюць у аўтара, што мае ён на думцы, але часам прыходзіцца ламаць прынцыпы. У „Хаосе" чытаем: „Толькі ў самаабвярганні можна развівацца, не ў тоеснасці".

— Чакаў я, калі мяне нехта запытае пра гэта. *Ptakodrzew* у самой назве скрывае супярэчнасць. Сімвалам традыцыі з'яўляецца непарыўная лінія, з пакалення ў пакаленне, укараненне, якое гарантуе басперапынасць. Мой *ptakodrzew* з аднаго боку імкнецца да ўкаранення, з другога да неабмежаванай свабоды. Гэта мой дыягназ сучаснага чалавека. Можна думаць пра гэта як пра супярэчнасць, але, па-мойму, гэта дапаўненне. Гегель казаў пра еднасць супярэчнасці, але ў самым вершы вядзецца дыялог Гегелевай логікі з логікай Арыстоцеля. Чалавек змагаецца з выбарамі паміж рознымі логікамі. А канчаткова можа быць так, што вырашыць чужы чалавек, які крыкне: „Niech żyje antylinia!".

— Ці кожны з нас абцяжараны такім хаосам?

— Калі чалавек мае свядомасць, што з'яўляецца такім *ptakodrzewem*, то можа папасці ў хаос.

— Вы ўпарадкавалі свой хаос?

— Імкнуўся я яго парадкаваць і, здаецца, дасягнуў гэтага не праз філасофію, а праз паэзію, бо толькі паэзія, побач філасофіі і рэлігіі, дазваляе раскрываць праўду аб чалавеку. Навука гэта тэорыі ці гіпотэзы, а ў аднясенні да чалавека патрэбная метафізіка, пачуццё сэнсу жыцця, чаго не знойдзеш у навуцы. Пазнай самога сябе, — казалі і Сакрат, і святы Аўгусцін. Калі пазнаеш сябе, гэта першы крок да разумення свету, але заўсёды праз прызму адзінкі.

— Ёсць ахвота часам памяняць раз ужо напісанае?

— Не маю такой ахвоты ў аднясенні да апублікаванага зборніка, але ў час працы такое бывае. Не толькі часам чалавек хоча нешта памяняць з перспектывы часу, але бывае, што ён яшчэ не даспеў да напісанага, бо яно было нейкім момантам натхнення, дарам, часам вынікам падсвядомасці. Я маю такі верш, да якога яшчэ не дарос.

ISSN 0546-1960